РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 ЧЭРВЕНЯ 2025 г. ЧАЦВЕР № 107 (30495)

## ТАМ, ДЗЕ ГАРТУЕЦЦА ВЕРА

**Абраны аб'екты для стварэння духоўных цэнтраў асноўных рэлігійных канфесій**



Ідэя стварэння гэтых цэнтраў была агучана Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам 10 лютага на сустрэчы з кіраўнікамі традыцыйных канфесій нашай краіны. Кожны з іх павінен стаць тым пунктам прыцяжэння, які будзе знаёміць з культурай, традыцыямі, гісторыяй нашага народа, садзейнічаць умацаванню міжканфесійнага міру.

СТАР. 3

# ШЛЯХАМ СЯБРОЎСКІХ АДНОСІН

**Лідары Беларусі і Кітая Аляксандр Лукашэнка і Сі Цзіньпін пацвердзілі курс на ўмацаванне сяброўства і супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі**



Фота БелТА.

Візіт кіраўніка беларускай дзяржавы ў Кітай завершаны. Дні знаходжання Аляксандра Лукашэнкі ў Пекіне былі напоўнены перагаворамі з прадстаўнікамі кітайскіх дзелавых колаў. Галоўнае ж мерапрыемства — сустрэча з Сі Цзіньпінам, якая ўпершыню прайшла дома ў кітайскага лідара — у рэзідэнцыі Чжуннаньхай. Гэта знак асаблівай прыхільнасці і дружбы паміж кіраўнікамі дзяржаў.

«Літаральна побач мой кабінет. Упершыню тут я вас прымаю», — сказаў пры сустрэчы Сі Цзіньпін.

Аляксандр Лукашэнка ў сваю чаргу адзначыў, што вельмі цэніць дружалюбнасць кітайскага калегі:

**«Яна падкрэслена тым, што вы запрасілі мяне ў свой дом. Я вам вельмі ўдзячны і, зразумела, буду чакаць вас у сваім доме».**

«Мяне таксама здзіўляе і ўражвае дагэтуль, хоць я 15-ы раз у Кітаі і ў мяне 30-гадовы тэрмін супрацоўніцтва з КНР, ваша стаўленне да гасцей. Паверце, гэта агульнае меркаванне. Мы з прэзідэнтамі, асабліва постсавецкіх рэспублік, часта абменьваемся гэтымі думкамі. У нас аднолькавае меркаванне. І мы гэта разумеем і вельмі цэнім», — дадаў Прэзідэнт Беларусі.

Старшыня КНР з цеплынёй прывітаў Прэзідэнта Беларусі, падкрэсліўшы даўнюю асабістую дружбу.

«Хачу яшчэ раз вас павіншаваць з перавыбраннем Прэзідэнтам Беларусі. Гэта ў поўнай меры сведчыць аб падтрымцы і даверы народа Беларусі ў ваш адрас.

**Упэўнены, што пад вашым кіраўніцтвам Беларусь абавязкова дасягне яшчэ больш яркіх новых поспехаў у дзяржаўным будаўніцтве», — сказаў Сі Цзіньпін.**

Размова лідараў працягвалася дзве з паловай гадзіны. Падводзячы вынікі візіту ў кароткім інтэрв'ю журналістам, Аляксандр Лукашэнка сказаў:

**«Усё прайшло як мага лепш. Мы з сябрам сустрэліся, паразмаўлялі. Дамовіліся аб тым, што мы павінны інтэнсіфікаваць нашы адносіны. Вельмі ўдачна».**

«Гэта была сямейная сустрэча ў вузкім асяроддзі. Не афіцыйная, не рабочая — сямейная. Тым не менш, кітайцы ёсць кітайцы — яны арганізавалі ўсё на высокім узроўні. Малайцы. Таму мы і з рэальным сектарам эканомікі, з фінансамі (прадстаўнікамі гэтых сфер. — **«Зв.»**) сустрэліся, перагаварылі. А сёння са Старшынёй (Сі Цзіньпінам. — **«Зв.»**), міністрам замежных спраў Ван І — стары наш сябар, — расказаў Прэзідэнт. — Я лічу, што візіт быў паспяховым. А галоўнае, для іх (адказных з абодвух бакоў. — **«Зв.»**) калідор пашыраны — дзейнічайце. Таму я і гавару паслу: «Галавой адказваеце за адносіны з Кітаем. Гэта для нас новыя магчымасці».

Сі Цзіньпін падкрэсліў, што паміж Беларуссю і Кітаем мацнее традыцыйная дружба, умацоўваецца непарушны палітычны ўзаемадавер, пашыраецца супрацоўніцтва практычна ва ўсіх сферах. «Мы захоўваем цесныя кантакты і каардынацыю ў міжнародных справах — і ў рамках ШАС, і ў рамках ААН. Як і вы, як і наша краіна, ніколі не падпарадкоўваемся якому-небудзь міжнароднаму гегеманізму, палітыцы цкавання. Разам мы абараняем міжнародную справядлівасць і роўнасць», — сказаў кітайскі лідар.

Ён таксама запрасіў Прэзідэнта Беларусі на саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва і парад у Пекіне, якія пройдуць у канцы жніўня — пачатку верасня бягучага года.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што цяпер позіркі многіх дзяржаў, у тым ліку і Беларусі, звернуты на Пекін.

«Вы вельмі правільна адзначылі асноўную асаблівасць цяперашняга часу — беспрэцэдэнтны ціск з боку Захаду на нас, перш за ўсё на Кітайскую Народную Рэспубліку. І сёння позіркі многіх дзяржаў, як і Беларусі, звернуты на вас — на Пекін», — сказаў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, яшчэ 5 гадоў таму гаварылі:

**«Калі Кітай вытрымае, значыць, планета будзе ўраўнаважана і будзе існаваць».**

«Сёння ўжо кажуць: «Кітай вытрымаў, вытрымае і Кітай не дазволіць зламаць сусветны парадак. У гэтым пераканаlittleны многія-многія народы. Кіраўнікі дзяржаў, з якімі я сустракаўся, мне аб гэтым гаварылі», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Паводле БелТА.**



Фота БелТА.

## АБІТУРЫЕНТ-2025

## ЧАС ВЫЗНАЧАЦЦА З ВЫБАРАМ



Сёння, 5 чэрвеня, у Беларусі праходзіць апошняе цэнтралізаванае тэсціраванне ў асноўныя тэрміны ўступнай кампаніі. Свае веды дэманструюць абітурыенты па прадмеце на выбар: грамадазнаўства, фізіка, хімія, гісторыя Беларусі. Застаюцца рэзервовыя дні — 19, 21 і 23 чэрвеня, і ўжо з 1 ліпеня можна будзе атрымаць сертыфікаты і вызначацца з тым, куды несці дакументы для атрымання вышэйшай адукацыі. А значыць, прыйшоў час задумацца аб самых запатрабаваных у краіне прафесіях. Пра іх, а таксама пра іншыя нюансы сёлетняй уступнай кампаніі — у нашых матэрыялах.

СТАР. 2

## МЕСЦА СУСТРЭЧЫ ДЗЕЛАВЫХ ЛЮДЗЕЙ

**Бізнес любіць канфідэнцыяльнасць, а Беларусь для асабістых перагавораў — цалкам прыдатнае месца**

У мінулым дзесяцігоддзі, калі глабалізацыя і еўрапейскі капітал усё больш шчыльна пранікалі ў краіны СНД, у Беларусі лунала ідэя развіваць дзелавы турызм. Грэх было не выкарыстоўваць наша выгаднае геаграфічнае становішча для сустрэч дзелавых колаў Усходу і Захаду. Пры дастаткова добрай і яскраснай інфраструктуры правядзенне розных семінараў, карпаратыўных нарад і іншых мерапрыемстваў абыходзілася ў Мінску танней, чым у Маскве ці Берліне.

СТАР. 4



# МАШЫНАБУДАВАННЕ, ЛІЧБАВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ, МЕДЫЦЫНА...

**У якіх сферах Беларусь і Кітай карысныя адно аднаму**

Падчас візіту Прэзідэнта Беларусі ў Кітай абмяркоўваліся розныя тэмы нашага супрацоўніцтва. Але асноўнай беларускі лідар назваў тэхнічную мадэрнізацыю — тое, без чаго немагчыма ўявіць нармальнае развіццё сучаснай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка часта нагадвае пра тое, што вытворчасць і прадпрыемствы павінны развівацца, удасканальвацца для таго, каб быць канкурэнтаздольнымі на рынках. Таму гэты візіт Прэзідэнта Беларусі ў Кітайскую Народную Рэспубліку адкрывае новыя перспектывы. Пэўныя напрацоўкі за гады супрацоўніцтва Беларусі і Кітая ўжо ёсць. Але, як вядома, сутнасць беларуска-кітайскіх адносін у пастаянным прагрэсе. Тым больш што 2024-ы і 2025-ы аб'яўлены гадамі супрацоўніцтва Беларусі і КНР у галіне навукі, тэхналогій і інавацый.



### НАМ ЁСЦЬ ЧАМУ ПАВУЧЫЦЦА Ў КІТАЙСКІХ ПАРТНЁРАЎ

**Старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Беларусі Сяргей ШЛЫЧКОЎ** расказаў аб дамоўленасці з Міністэрствам навукі і тэхналогій Кітая аб сумесных пілотных праектах, якія будуць прадугледжваць не толькі сумесныя навуковыя даследаванні і распрацоўкі, але і стварэнне на аснове іх вынікаў вытворчых магутнасцяў. «У прынцыпе, тры праекты мы ўжо выбралі. У іх ліку праект «Белшыны» па буйнагабарытных шынах, а таксама праект па лініі Мінтранса, які датычыцца самых сучасных тэхналогій па стварэнні дарожнай інфраструктуры. Трэці праект — у галіне матэрыялазнаўства», — расказаў ён.

Сяргей Шлычкоў больш падрабязна спыніўся на праекце з «Белшынай». Прадугледжваецца, што пры вытворчасці буйнагабарытных шын павінны выкарыстоўвацца не толькі адпаведныя матэрыялы непасрэдна для самой пакрышкі, але і спецыяльная канструкцыя, бо буйнагабарытныя — значыць, буйнатанажныя. «Каб у поўным аб'ёме забяспечыць патрэбнасці БелАЗа, у тым ліку для машын з самай высокай грузападымальнасцю, такіх кампетэнцый у нас не хапае. Дапаўняючы кампетэнцыі адно аднаго, мы з кітайскімі калегамі займаемся такім сумесным праектам», — растлумачыў Старшыня ДКНТ.

СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby.
Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

# МАШЫНАБУДАВАННЕ, ЛІЧБАВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ, МЕДЫЦЫНА...



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Беларусь і Кітай неаднаразова аб'яўлялі сумесныя конкурсы навукова-тэхнічных праектаў. Сяргей Шлычкоў падкрэсліў, што ў цэнтры ўвагі — самыя запатрабаваныя, перспектыўныя і прыярытэтныя тэматыкі. «Гэта ўсё, што адносіцца да «лічбы»: штучны інтэлект, машынны зрок, рабатызацыя. Прычым гэтыя ж тэхналогіі прымяняюцца і ў іншых галінах. Напрыклад, у трэндзе лічбавізацыі машынабудавання. Вельмі шмат цікавых праектаў у галіне аховы здароўя. Пры гэтым вынікі падобных навуковых даследаванняў, як правіла, у форме методык, часам абсталявання, укараняюцца і ў нас, і ў Кітаі», — адзначыў ён.

**Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў КНР Аляксандр ЧАРВЯКОЎ** у эфіры тэлеканала СТБ падкрэсліў, што Кітай абраў стратэгію развіцця і прадукцыйных сіл новай якасці, заснаваных на інавацыях, на лічбавых платформах. «Грунтуючыся на кітайскіх тэхналогіях, мы тым самым пераносім гэтыя інавацыйныя падыходы ў сваю эканоміку. Кітайскі бок усяляк падтрымлівае нашы ініцыятывы, і мы бачым іх адкрытасць і ў доступе, і ў пошуку новых кірункаў», — падкрэсліў пасол.

І гэта не проста прыгожыя словы, а факты, пацверджаныя практыкай. **Кіраўнік адміністрацыі Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» Аляксандр ЯРАШЭНКА** ў эфіры «Першага інфармацыйнага» адзначыў, што мала хто ўмее весці бізнес так, як кітайскія партнёры, і ў гэтым плане беларусам ёсць чаму павучыцца. «Гаворка ідзе аб выбудоўванні правільнай мадэлі камерцыйнага поспеху, выбудоўванні, зноў жа, тэхналогій, у якіх Кітай цяпер атрымаў поспех», — расказаў ён. Па словах Аляксандра Ярашэнкі, той факт, што падчас гэтага візіту Прэзідэнта ў Кітай абмяркоўвалася пытанне тэхналагічнага ўзаемадзеяння, для Беларусі вельмі важны. «Так, мы маем свае канкурэнтныя перавагі, развітыя тэхналогіі, але Кітай сышоў далёка наперад. Для таго каб нам не застацца на ўзбочыне развіцця сусветнага працэсу, трэба ісці наперад разам. Менавіта гэтым займаемся ў «Вялікім камені», — адзначыў ён. — У «Вялікім камені» кітайскіх інвестараў каля 40 % — гэта 61 праект. Усяго кітайскімі партнёрамі ў парк укладзена больш чым 300 мільёнаў долараў, а гэта значыць, што яны прывезлі сюды свае тэхналагічныя навінкі, распрацоўкі, абсталяванне, на якім выпускаецца прадукцыя».

У парку сфарміравалася некалькі кластараў. Кітайскія партнёры вельмі актыўныя ў галіне навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ, плённа развіваецца медыцынскі кластар. Аляксандр Ярашэнка падкрэсліў, што парк працуе над прыцягненнем як інавацыйнай, так і традыцыйнай кітайскай медыцыны. «Мы хацелі б развіваць і паслугі кітайскай медыцыны, робім для гэтага заканадаўчыя ініцыятывы, каб тут кітайскі медык адчуваў сябе не горш, чым у Кітаі», — заўважыў ён.

## СУР'ЁЗНАЯ ЗАЯЎКА НА ЗАХАВАННЕ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

**Палітолаг Юрый ШАЎЦОЎ** у эфіры ток-шоу «Будні» на «Альфа-Радыё» зрабіў акцэнт на тым, што сёння ў свеце адбываецца велізарная тэхналагічная рэвалюцыя, звязаная са штучным інтэлектам і не толькі. «І тыя, хто не ўпішацца ў гэту рэвалюцыю, надоўга адстануць. А Кітай сёння — другі полюс на планеце ў гэтым працэсе. Акрамя таго, Кітай перад сабой паставіў задачу да канца 2020-х гадоў стаць сусветным лідарам у галіне штучнага інтэлекту. І яны цвёрда да гэтага ідуць. Яны ідуць да яшчэ адной мэты — стаць першай па аб'ёме эканомікай планеты», — адзначыў ён. У сувязі з гэтым, па словах эксперта, размова аб мадэрнізацыі як мінімум часткі нашай прамысловасці ў кантэксце кітайскіх планаў — вельмі сур'ёзная заяўка на захаванне Беларуссю прамысловасці ва ўмовах, калі адбываецца тэхналагічны пераварот. «Мы прывязваемся да другога на сёння тэхналагічнага полюса планеты, які мае ўсе шанцы стаць першым. У аснове нашай эканомікі — прамысловасць, і ўсё, што звязана з ёй, прынцыпова важна для Беларусі, — падкрэсліў Юрый Шаўцоў. — Нас жа санкцыямі і ўсімі астатнімі захадамі моцна пасунулі з заходніх рынкаў. І наўрад ці гэта скончыцца ў хуткім часе. Таму трэба чапляцца за тое, за што можна зачапіцца. І ўвага Кітая да такой аддаленай для іх, кампактнай краіны па пытанні захавання прамысловасці, вядома, стварае перадумовы, падставы для вялікіх праектаў».

Юрый Шаўцоў заўважыў, што Кітай зрабіў высновы з гісторыі Савецкага Саюза, у тым ліку з распаду СССР. Яны лічаць небяспечным прамое жорсткае біпалярнае ўладкаванне свету, то-бок ідэалагічнае супрацьстаянне паміж камуністычнай дзяржавай і Захадам. «Таму Кітай з усіх сіл імкнецца не ператварыцца ў другі полюс планеты. Але яго вымушаюць ім стаць. Іх выштурхоўваюць з Захаду прыкладна так, як Расію і Беларусь. І гэта культура выштурхоўвання, натуральна, выклікае ў Кітаі супраціўленне. І яны вымушаны выбудоўваць усё больш насцярожаную палітыку ў дачыненні да Захаду. Паступова яны дайшлі да неабходнасці стварэння сваёй супольнасці дзяржаў вакол Кітая. Самастойнасць Кітая адносна Захаду будзе ўзмацняцца. І ў рамках гэтай тэндэнцыі яны будуць вымушаны ствараць вакол сябе ўсё больш магутныя супольнасці краін», — дадаў госць праграмы.

## АДЗНАЧАЕЦЦА АКТЫЎНАЯ ДЫНАМІКА ПАСТАВАК

Беларуска-кітайскія адносіны развіваюцца ў глабальным сэнсе, на ўзроўні лідараў. Але і рэгіянальнае супрацоўніцтва, на вялікае значэнне якога часта звяртае ўвагу Аляксандр Лукашэнка, таксама наладжана належным чынам. На гэтым акцэнтавала ўвагу **Ала СМАЛЯК, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы**. «Нягледзячы на тое, што нашы краіны раздзяляюць тысячы кіламетраў, мы на многія пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі, светабудовы і светапарадку глядзім у адным кірунку, з адной пазіцыі. Нам зразумелыя і блізкія ключавыя каштоўнасці, і жыццёвыя арыенціры адно аднаго. Мы паспяхова рэалізоўваем узаемавыгадныя праекты ў эканамічнай сферы, штогод значна прырастаем па ўзроўні двухбаковага тавараабароту. Паспяхова развіваецца партнёрства і на міжрэгіянальным узроўні. Так, напрыклад, за апошнюю пяцігодку тавараабарот Гомельскай вобласці з Кітаем вырас удвая. Актыўная дынаміка ўзаемных паставак адзначаецца і сёлета. Нямала прыкладаў паспяховага ўзаемадзеяння ёсць у інвестыцыйнай сферы, у гуманітарным, спартыўным, адукацыйным, культурным і многіх іншых кірунках», — расказала яна.

**Падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# УЗАЕМНАЯ ЦІКАВАСЦЬ

## Прамкааперацыя і сумесныя вытворчасці – дынаміка развіцця эканомікі

У рамках рабочага візіту Прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандра ТУРЧЫНА ў Душанбэ, куды ён накіраваўся для ўдзелу ў пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў СНД, учора адбыўся шэраг сустрэч з калегамі — прэм'ерамі Таджыкістана і Казахстана.



### КІРУНАК, У ЯКІМ ТРЭБА РУХАЦЦА



На сустрэчы з **прэм'ер-міністрам Таджыкістана Кахірам РАСУЛЗАДАЙ** Аляксандр Турчын акцэнтаваў увагу на тым, што супрацоўніцтва Беларусі і Таджыкістана характарызуецца дынамічным развіццём гандлёва-эканамічных адносін.

— Па выніках мінулага года мы дасягнулі нядрэнных вынікаў. Аб'ём двухбаковага тавараабароту перавысіў 168 мільёнаў долараў, што дазволіла нашай краіне ўвайсці ў дзясятку асноўных знешнегандлёвых партнёраў Таджыкістана, — падкрэсліў Прэм'ер-міністр Беларусі.

Ён падзякаваў свайму калегу за цёплы прыём на таджыкскай зямлі:

— Падмуркам нашых адносін служаць адносіны нашых лідараў. Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, калі гаворыць пра кіраўніка Таджыкістана — гэта заўсёды асаблівая цеплыня, асаблівая павага. У нас ёсць пачуццё задавальнення ад нашага супрацоўніцтва.

Кіраўнік беларускага ўрада выказаў упэўненасць, што новы імпульс двухбаковым адносінам надасць адкрыццё ў Мінску гандлёвага дома Таджыкістана.

— Усе рашэнні прынятыя, і цяпер застаецца прыступіць да актыўнай фазы рэалізацыі гэтага праекта. Таму, мяркую, гэта будзе яшчэ адным крокам да таго, каб нашы краіны лепш пазнавалі адна адну і нашы гандлёва-эканамічныя адносіны рухаліся наперад, — падкрэсліў ён.

Аляксандр Турчын дадаў, што ў рамках рабочага візіту запланавана наведванне прадпрыемства «Агратэхсэрвіс», якое займаецца зборкай тэхнікі.

— Стварэнне сумесных прадпрыемстваў на тэрыторыі Таджыкістана і нашай краіны — гэта важны і правільны кірунак, таму што вырашае нашы агульныя задачы. Мяркую, гэта правільны кірунак, у якім нам неабходна рухацца, — падсумаваў Аляксандр Турчын.

У сваю чаргу прэм'ер-міністр Таджыкістана Кахір Расулзада адзначыў, што дзякуючы палітычнай волі супрацоўніцтва Беларусі і Таджыкістана даўно выйшла на ўзровень стратэгічнага партнёрства:

— Беларуска-таджыкскія адносіны на сучасным этапе характарызуюцца высокім дынамізмам. Ключавую ролю ў падтрыманні высокага ўзроўню адносін адыгрываюць шчырыя, дружалюбныя, брацкія сувязі паміж прэзідэнтамі дзвюх краін.

Ён нагадаў, што толькі за чатыры месяцы бягучага года адбыліся дзве тэлефонныя размовы кіраўнікоў дзяржаў, падчас якіх былі абмеркаваны актуальныя пытанні двухбаковага ўзаемадзеяння і намечаны далейшыя крокі па пашырэнні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

— Актыўна развіваецца міжпарламенцкае ўзаемадзеянне. Беларусь і Таджыкістан прытрымліваюцца падобных пазіцый па многіх міжнародных пытаннях, актыўна ўзаемадзейнічаюць у рамках міжнародных, рэгіянальных арганізацый, — дадаў прэм'ер-міністр Таджыкістана.

### ПАТЭНЦЫЯЛ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ ЁСЦЬ



Пасля размовы з таджыкскім калегам адбылася сустрэча Аляксандра Турчына з **прэм'ер-міністрам Казахстана Алжасам БЕКЦЕНАВЫМ**, які таксама прыбыў у Душанбэ для ўдзелу ў пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў СНД.

— Казахстан — не чужая краіна, — падкрэсліў у пачатку сустрэчы Аляксандр Турчын.

Ён нагадаў, што ў свой час, працуючы на пасадзе першага віцэ-прэм'ера, узначальваў беларускую частку міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве:

— Насамрэч мы тады вельмі шмат карыснага зрабілі для нашых дзвюх краін.

Прэм'ер-міністр выказаў задавальненне дасягнутым узроўнем двухбаковых гандлёва-эканамічных адносін:

— Сёння дзякуючы адносінам лідараў нашых краін узаемадзеянне знаходзяцца на высокім узроўні, і гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва (для нас Казахстан — найважнейшы партнёр) знаходзіцца ў добрым стане, але заўсёды ёсць да чаго імкнуцца, — падкрэсліў Аляксандр Турчын.

Вяртаючыся ў перыяд свайго сустаршынства ў міжурадавай камісіі, Прэм'ер-міністр Беларусі адзначыў, што бакі рэалізавалі тады шмат праектаў па стварэнні сумесных вытворчасцяў, асабліва ў сферы машынабудавання, падкрэсліўшы, што Беларусь і Казахстан абсалютна дакладна выбралі ключавы вектар развіцця супрацоўніцтва ў прамысловай сферы і развіцці вытворчай кааперацыі.

— Мяркую, гэта было абсалютна правільнае рашэнне, і цяперашняя сітуацыя паказвае, што рэалізацыя такіх мерапрыемстваў адпавядае інтарэсам нашых краін, — падкрэсліў кіраўнік беларускага ўрада. — Таму зборачныя вытворчасці беларускіх камбайнаў, трактароў, грузавых аўтамабіляў рухаюцца на нармальным узроўні. Але ёсць яшчэ тэма зборкі кар'ернай тэхнікі, іншыя пытанні, якія, на мой погляд, патрабуюць пэўнай інтэнсіфікацыі ў нашых адносінах.

Таксама Аляксандр Турчын падзякаваў свайму казахстанскаму калегу за ўзгадненне адкрыцця Генконсульства нашай краіны ў Алматы і выказаў упэўненасць, што да канца бягучага года яно адчыніць свае дзверы.

— У найбліжэйшы час асноўнай задачай бачу павелічэнне ўзаемных намаганняў па нарошчванні станоўчай дынамікі ў гандлі. Патэнцыял для таго, каб павялічыць пастаўкі тавараў, як беларускіх, так і казахстанскіх, існуе, — канстатаваў Прэм'ер-міністр Беларусі.

Са свайго боку Алжас Бекценаў канстатаваў: адносіны паміж нашымі краінамі развіваюцца дынамічна, па ўзыходзячай па ўсім спектры адносін.

— Задача двух урадаў — вельмі эфектыўна і актыўна займацца рэалізацыяй тых дамоўленасцяў, якія дасягнуты і дасягаюцца на вышэйшым узроўні, — падкрэсліў ён. — Упэўнены, што ў нас з вамі гэта атрымаецца. Асноўны фокус — эканоміка.

**Тавараабарот у нас па выніках мінулага года склаўся на ўзроўні 900 мільёнаў долараў. У першым квартале гэтага года дынаміка станоўчая, тавараабарот толькі за квартал дасягнуў 200 мільёнаў, гэта на 3,6 % больш, чым летась.**

Зачын ёсць, патэнцыял вельмі вялікі, таму нам ёсць куды ісці і імкнуцца.

ГЭТА ПРЭСТЫЖНА

# «УРАЧ ПАВІНЕН ПАДАВАЦЬ СТАНОЎЧЫ ПРЫКЛАД СВАІМ ПАЦЫЕНТАМ»



## Чаму айчынная медыцынская адукацыя не горшая за замежную



Пагаварылі з першым прарэктарам ГрДМУ Андрэем БОЛТАЧАМ аб сёлетняй прыёмнай кампаніі і перавагах мэтавага навучання.

### УПОР НА ПРАКТЫКУ

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт славіцца сваёй багатай гісторыяй і традыцыямі медыцынскай адукацыі. Тут дзейнічае шэсць факультэтаў, падрыхтоўка вядзецца па спецыяльнасцях «Педыятрыя», «Лячэбная справа», «Медыка-дыягнастычная справа» і «Медыка-псіхалагічная справа». У сярэднім штогод ВНУ выпускае 600—700 маладых спецыялістаў. Выпуск 2024 года склаў 750 чалавек.

*— У першую чаргу мы робім упор на практыка-арыентаванае навучанне. Заняткі праходзяць у сучасных карпусах, клінічных базах і лабараторыях. Студэнты маюць магчымасць практыкавацца ў найлепшых бальніцах рэгіёна, што садзейнічае набыццю рэальных навыкаў,* — расказаў Андрэй Болтач. *— З першага курса яны навучаюцца ў нашым сімуляцыйна-атэстацыйным цэнтры. Дзякуючы абсталяванню і рэалістычным сімулятарам многія кафедры ўкаранілі аб'ектыўна-структураваны клінічны экзамен.*

У адукацыйным працэсе ў ВНУ шырока выкарыстоўваюцца інфармацыйныя тэхналогіі, актыўныя метады навучання і работа з партнёрамі. Дзякуючы новым методыкам многія студэнты з году ў год становяцца пераможцамі міжнародных алімпіяд па фундаментальных і клінічных дысцыплінах. Ва ўніверсітэце таксама працуюць зімовыя і летнія навукова-адукацыйныя школы. Узровень выкладання і навуковай дзейнасці ўстановы пацверджаны мноствам дзяржаўных і міжнародных узнагарод. Гэтыя поспехі сталі магчымымі дзякуючы зладжанай рабоце выкладчыкаў, студэнтаў і супрацоўнікаў. А гэта значыць, што студэнт можа быць упэўнены ў якасці адукацыі і не шукаць, напрыклад, варыянты за мяжой.

### ГАРАНТАВАНАЕ ПЕРШАЕ ПРАЦОЎНАЕ МЕСЦА

Выпускнікі бюджэтнай формы навучання ў мінулым годзе пераважна былі размеркаваны ў Гродзенскую, Брэсцкую і Мінскую вобласці. Дарэчы, 98 % выпускнікоў платнай формы навучання ГрДМУ таксама выбралі для сябе размеркаванне на першае працоўнае месца.



Усё большую вагу сярод формаў навучання займае мэтавая падрыхтоўка. ГрДМУ рыхтуе спецыялістаў у інтарэсах арганізацый па ўсёй краіне. Падставай для ўдзелу ў конкурсе на месца для атрымання вышэйшай адукацыі на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі з'яўляецца дагавор, падпісаны абітурыентам і арганізацыяй.



У мэтавага навучання ёсць шэраг пераваг, на якія трэба звярнуць увагу. Гэта больш простая працэдура паступлення — трэба здаць толькі ўнутраны экзамен па біялогіі. А таксама выпускніку гарантавана першае працоўнае месца, прычым вядомае з першага курса.

*— Выпускнікі мэтавай формы навучання размяркоўваліся ў адпаведнасці з рэгіянальнай прыналежнасцю і заключанымі дагаворамі,* — адзначыў Андрэй Болтач. *— У цэлым сярод выпускнікоў няма абмежаванняў па населеных пунктах, дзе даецца першае працоўнае месца. Так, магчыма размеркаванне ў буйныя раённыя цэнтры і ў абласныя гарады для тых, хто за час навучання паказаў высокія вынікі ў вучобе, навуцы, грамадскім жыцці і спорце.*

### ЗАПАТРАБАВАНАСЦЬ

ГрДМУ — адзіны ўніверсітэт у Беларусі, дзе шмат гадоў дзейнічае медыка-псіхалагічны факультэт. Выпускнікам дадзенага факультэта прысвойваецца кваліфікацыя «Урач», а пасля праходжання інтэрнатуры: «Урач-псіхіятр-нарколаг», «Урач-псіхатэрапеўт» і «Урач-псіхіятр дзіцячы». Пасля стажыроўкі — «Дзяржаўны судовы эксперт-псіхіятр».

*— Выпускнікі гэтага факультэта шырока запатрабаваны не толькі ў сістэме аховы здароўя, але і ў арганізацыях. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства адукацыі і Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз зацікаўлены ў нашых выпускніках. У 2025 годзе выпуск гэтых унікальных спецыялістаў складзе 120 чалавек. Працаўладкаваны будуць студэнты як бюджэтнай, так і платнай формы навучання. Геаграфія размеркавання living разнабаковая: ад цэнтральных раённых бальніц да Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя.*

### МАРЫ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА

У сям'і Мацвея Лянцэвіча, студэнта 4 курса лячэбнага факультэта, ніхто ў медыцыне не працуе, але малады чалавек заўсёды захапляўся дадзенай сферай і марыў, што аднойчы ўвойдзе ў гэту прафесію.

*— Малым жартаваў, што буду ўрачом. Сур'ёзна над гэтым задумаўся ў 7 класе. Канчатковае рашэнне аб паступленні ў медыцынскі ўніверсітэт прыняў пасля перамогі на адным з конкурсаў па хіміі. Хачу быць анестэзіёлагам-рэаніматолагам. Яшчэ мне хацелася б выкладаць, сумяшчаць навуковую дзейнасць з практычнай.*

Мацвей адзначае, што медыцына вымушае заўсёды знаходзіцца ў тонусе, быць у курсе апошніх даследаванняў. Анестэзіялогія і рэаніматалогія ахопліваюць усе раздзелы медыцыны, бо трэба дакладна разумець, як працуе арганізм, а таксама дасканала валодаць ведамі па фармакалогіі.

*— Анестэзіялогія і рэаніматалогія — кірунак, які дынамічна развіваецца. Да таго ж ён патрабуе прыняцця імгненных рашэнняў. Як правіла, пацыенты рэанімацыі знаходзяцца ў цяжкім стане, таму трэба хутка і дакладна вырашаць, што рабіць. І ты адразу бачыш вынік тваёй працы. У анестэзіялогіі таксама няма часу на разварушванне, ты тут і цяпер прымаеш рашэнні ў залежнасці ад таго, як ідзе аперацыя. Вельмі важна зладжана ўзаемадзейнічаць з хірургічнай камандай.*

Нягледзячы на ўсе складанасці, Мацвей любіць выбраную прафесію і ганарыцца ёю. Кажа, што ў цэлым стрэсаўстойлівы чалавек, да таго ж сам працэс навучання дапамагае выпрацаваць пэўныя навыкі самарэгуляцыі. Ды і сам ён чалавек захоплены, і цяга да ведаў і самаўдасканалення вельмі дапамагае. Таксама ідзе на карысць досвед работы ў брыгадзе хуткай дапамогі.

*— Праграма ва ўніверсітэце пабудавана так, што ты паступова ўваходзіш у курс справы, збіраеш веды, якія ўжо потым стануць падмуркам пры вывучэнні выбранай спецыялізацыі. Натуральна, што ўніверсітэт клапоціцца і аб тым, каб студэнты маглі праяўляцца творча. У нас праходзяць розныя мерапрыемствы, ёсць творчыя калектывы, навуковыя гурткі. Бо важна ўмець пераключацца. Існуе студэнцкае супрацоўніцтва, якое садзейнічае рэалізацыі ідэй моладзі.*

Урач — гэта самаадданая праца. Яна патрабуе звышканцэнтрацыі, але пры гэтым дае неабмежаванае поле для прафесійнага развіцця. А таксама медык павінен валодаць пэўнымі маральнымі якасцямі.

*— Урач павінен быць прыстойным і падаваць станоўчы прыклад сваім пацыентам. Ну і, безумоўна, важна любіць сваю справу. На мой погляд, без гэтага добрым урачом стаць нельга,* — рэзюмаваў Мацвей.

**Веранiка КАЗЛОЎСКАЯ.**
**Фота аддзела па сувязях з грамадскасцю ГрДМУ.**

**Кампетэнтны каментарый**

## «ПАВЯЛІЧВАЕМ «БЮДЖЭТ» ПА АКТУАЛЬНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ»

У спісе найбольш запатрабаваных у эканоміцы краіны 69 спецыяльнасцяў: інжынерныя, педагагічныя, медыцынскія і сельскагаспадарчыя.

— Набор у ВНУ захоўваецца на ўзроўні мінулага года, — гаворыць **начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Мінадукацыі Сяргей ПІШЧОЎ**. — У цяперашнюю ўступную кампанію ва ўніверсітэтах нашай краіны гатовы прыняць 48,2 тысячы студэнтаў. На бюджэтную форму план набору павялічаны на 400 чалавек у параўнанні з мінулагоднім. Усяго на бюджэт плануецца прыняць каля 31,8 тысячы маладых людзей. Заўважу, што план прыёму сфарміраваны з улікам найбольш запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцяў і прывядзення ў адпаведнасць структуры набору ва ўніверсітэты з перспектыўнай патрэбай заказчыкаў кадраў.

Прадстаўнік ведамства таксама звярнуў увагу на падрыхтоўку школьнікаў у профільных класах (групах) інжынернай накіраванасці на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Сёння такіх класаў — 580, у іх навучаецца каля 6,5 тысячы школьнікаў. На падыходзе першы выпуск.

— Выпускнікі інжынерных класаў, а гэта каля 2,5 тысячы чалавек, пры ўмове выдатнай паспяховасці, а таксама пры наяўнасці рэкамендацыі педагагічнага савета школы, змогуць паступіць у ВНУ па сумоўі на найбольш запатрабаваныя эканомікай інжынерныя і педагагічныя спецыяльнасці ўжо сёлета, — гаворыць Сяргей Пішчоў.

Яшчэ адна траекторыя навучання, якая здольная запоўніць у будучыні нішу матываваных студэнтаў, а пасля заканчэння ВНУ і неабходных спецыялістаў, — мэтавікі.

— Пры прыёме абітурыентаў у ВНУ на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ў 2025 годзе будуць выкарыстоўвацца падыходы, якія мы паспяхова прымянялі летась. Гэта паступленне па конкурсе сярод асобных арганізацый-заказчыкаў, сярэдні бал дакумента аб адукацыі па большасці спецыяльнасцяў — не ніжэйшы за 7,0 (акрамя найбольш запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцяў), уключэнне ў склад экзаменацыйных камісій выкладчыкаў ВНУ і настаўнікаў школ. Дарэчы, колькасць мэтавых месцаў у ВНУ ў параўнанні з 2024-м павялічылася на 800 і складае каля 6,4 тысячы, — адзначыў начальнік галоўнага ўпраўлення.

Сяргей Пішчоў не пакінуў без увагі і такое важнае для абітурыентаў пытанне, як адкрыццё новых спецыяльнасцяў.

— У 2025 годзе адкрыта падрыхтоўка па 10 новых спецыяльнасцях у сістэме вышэйшай адукацыі, па пяці — сярэдняй спецыяльнай і па чатырох кваліфікацыях — прафесійна-тэхнічнай адукацыі, — канкрэтызаваў ён.

# ТАМ, ДЗЕ ГАРТУЕЦЦА ВЕРА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Згодна з прапановай Прэзідэнта, кіраўнікі рэлігійных канфесій вызначылі месцы, дзе будуць стварацца духоўныя цэнтры. І на сустрэчы з Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандрам Румакам, якая прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, абмеркавалі пытанні падрыхтоўкі комплекснага плана іх развіцця. У цэнтры ўвагі — рэлігійныя аб'екты, якія ўжо сёння прыцягваюць не толькі прадстаўнікоў пэўных канфесій, але і паломнікаў, турыстаў.**

**У праваслаўных гэта Свята-Успенскі Жыровіцкі манастыр і Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр у Полацку.** Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Веніямін заўважыў, што ў кожным рэгіёне Беларусі ёсць важныя святыні, але бясспрэчнай перавагай рэлігійных цэнтраў Полацка і Жыровічаў стала тое, што менавіта гэтыя мясціны кожны год наведвае вялікая колькасць людзей. Ён падзякаваў Прэзідэнту за дзяржаўную падтрымку — з яе дапамогай згаданыя рэлігійныя комплексы адрэстаўраваны, добраўпарадкавана тэрыторыя, што дазваляе ім далей развівацца і прыцягваць яшчэ больш наведвальнікаў.



Касцёл Узнясення Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў Будславе.

**Для стварэння каталіцкага духоўнага цэнтра выбраны Будслаў.** Штогод, каб пакланіцца абразу Будслаўскай Божай Маці і паўдзельнічаць у фэсце, які ўвайшоў у рэпрэзентатыўны Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, сюды прыязджаюць тысячы гасцей з Беларусі і замежжа. Мітрапаліт Мінска-Магілёўскай архіепархіі Рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі Іосіф Станеўскі заўважыў, што сёння ўзнімаюцца пытанні аб развіцці інфраструктуры горада, каб людзі тут маглі спыняцца на больш працяглы час, знаёміцца з гісторыяй.



Мячэць у Іўе.

**Прадстаўнікі іудзейскай канфесіі вызначылі, што Бабруйск,** які цяпер вельмі запатрабаваны ў турыстаў, **заслугоўвае таго, каб стаць духоўным цэнтрам.** Аднаўленая гарадская сінагога прымае не толькі вернікаў, але і гасцей, якія хочуць больш даведацца пра гісторыю і культуру беларускіх яўрэяў. У адрэстаўраваным яўрэйскім дворыку праводзяцца шматлікія мерапрыемствы, узведзена Сцяна плачу, дзе згадваюць пра ахвяр Вялікай Айчыннай вайны. Вернікі тут пакідаюць запіскі, якія пасля перадаюцца ў Іерусалім.



Сінагога ў Бабруйску.

**Для стварэння мусульманскага духоўнага цэнтра** разглядаліся Навагрудак, Смілавічы, Смаргоншчына. **Выбар жа быў зроблены на карысць Іўя,** дзе татары жывуць на працягу 625 гадоў. Тут захавалася не толькі мячэць, якая не зачынялася нават у часы ваеннага ліхалецця, але і вялікія татарскія могілкі. Самае ж галоўнае, на думку муфція Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Беларусі Абу-Бекір Шабановіча, тое, што ў Іўі прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў і веравызнання заўсёды жылі ў міры і ўзаемападтрымцы. Гэта вельмі цэняць кіраўніцтва і жыхары горада — у цэнтры стаіць помнік «У гонар сяброўства і згоды канфесій». Муфцій адзначыў важнасць стварэння духоўных цэнтраў: «Узаемапавага, сяброўства, міласэрнасць, якія характэрныя для ўсіх рэлігій, вельмі значныя і ляжаць у аснове палітыкі нашай дзяржавы, накіраванай на захаванне міралюбства».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

НАПЯРЭДАДНІ

# ЛЕТА ПАЧЫНАЕЦЦА З «ВЫТОКАЎ»

## Чым здзівіць фестываль у Паставах

Яркае беларускае лета пачынаецца маштабным фестывалем «Вытокі». Сёлета спартыўна-культурнае свята 5—7 чэрвеня прыме адзін з самых найпрыгажэйшых гарадоў Віцебшчыны — Паставы. «Трохдзённая праграма фестывалю абяцае быць вельмі насычанай. Гэта знаёмства з гісторыяй, кухняй і турыстычным патэнцыялам краю. Для юных удзельнікаў пройдуць ужо ўпадабаныя спартыўныя мерапрыемствы. На алімпійскім квэсце іх чакаюць цікавыя заданні і добрыя падарункі, — адзначыў **Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі Віктар ЛУКАШЭНКА.** — Абавязкова прыходзьце і прыязджайце сем'ямі, з сябрамі 5-га, 6-га і 7 чэрвеня ў Паставы. Будзем вельмі рады падарыць кожнаму добры настрой, зарад спартыўнай энергіі і бадзёрасці на ўсё лета».



Арганізатары падрыхтавалі вялікую праграму, у якой абавязкова знойдзецца занятак кожнаму. Тым, хто цікавіцца краязнаўствам, варта далучыцца да турыстычнай акцыі «Вандруй. Адчуй. Натхняйся» (яна будзе праходзіць усе тры дні). У рамках акцыі прадугледжана бясплатнае наведванне аб'ектаў, якія раскрываюць турыстычны патэнцыял раёна.

Аматарам мастацтва ў першы дзень фестывалю, 5 чэрвеня, варта наведаць Мастацкі інтэрактыў «стАРТ» ад галерэі «АртХаос», які адбудзецца на тэрыторыі новага скейт-ролер парку (16.30). Прафесійныя мастакі і ўсе ахвотныя разам афармяць пляцоўку новага шматпрофільнага комплексу для катання і заняткаў спортам. Беларуская кухня — гэта таксама мастацтва. Праект «Ежа з сэнсам», прэзентацыя якога адбудзецца ўвечары 5 чэрвеня (18.30), раскрые яе адценні. Першы дзень фестывалю завершыцца на гарадскім стадыёне вячэрнім паказам пад адкрытым небам фільма «Чэмпіён свету» аб захапляльным супрацьстаянні вялікіх шахматыстаў (20.00).

6 чэрвеня праграма фестывалю пачнецца на стадыёне сярэдняй школы № 1. Там пройдуць майстар-класы для дзяцей па розных відах спорту з удзелам знакамітых беларускіх спартсменаў. У 15.00 у скейт-ролер парку стартуе спартыўна-гістарычны квэст, які аб'яднае фізічную і разумовую актыўнасці. А ў 18.00 на стадыёне фізкультурна-спартыўнага комплексу адбудзецца ўрачыстая цырымонія адкрыцця фестывалю. Падчас яе таксама будзе адкрыты сучасны скейт-ролер парк з варкаўт-пляцоўкай — падарунак Паставам ад Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі. Вячэрняя праграма другога дня працягнецца тэатральнай пастаноўкай «Модны вадэвіль» ад ТЮГ і канцэртам.

Ключавой падзеяй трэцяга дня фестывалю стане ўжо традыцыйны «Алімпійскі квэст». Старт — у 13.00 на гарадскім стадыёне ФСК. Да ўдзелу запрашаюцца дзеці да 14 гадоў, якія змогуць праверыць свае сілы на 26 пляцоўках у 32 відах спорту. Удзельнікі паспрабуюць патрэніравацца на вяслярных трэнажорах, з дапамогай віртуальнай рэальнасці пракаціцца на велатрэку, выканаць прыёмы каратэ, дзюдо, барацьбы, а таксама прадэманстраваць сваё валоданне гімнастычнымі прадметамі. Дапамагаць юным атлетам у гэтым будуць кваліфікаваныя трэнеры і знакамітыя спартсмены. Тыя, хто прыкладзе максімум намаганняў, атрымаюць каштоўныя падарункі, сярод якіх — смарт-гадзіннік, музычная калонка, паўэрбанк.

Новай цікавай лакацыяй стане сумесны праект РНПЦ спорту і НАК Беларусі «У пошуках зорак: талент у кожным дзіцяці!». З выкарыстаннем спецыяльнага абсталявання хлопчыкі і дзяўчынкі змогуць прайсці комплекснае дыягнастычнае тэсціраванне для выяўлення схільнасці да таго ці іншага віду спорту. А пакуль дзеці будуць адкрываць для сябе свет спорту, дарослыя змогуць наведаць канцэрты, модныя паказы і разнастайныя гандлёвыя пляцоўкі. Вячэрні канцэрт (20.00, стадыён ФСК) з удзелам зорак беларускай эстрады дазволіць пачуць найлепшыя песні нашых выканаўцаў.

Больш падрабязную праграму фестывалю «Вытокі» ў Паставах можна паглядзець на сайце Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота НАК Беларусі.**

СОЦЫУМ

# З КЛОПАТАМ АБ ТЫХ, ХТО ЗАСЛУЖЫЎ

## Што змянілася ў аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні?

З мая ўзмоцнена сацыяльная падтрымка некаторых уразлівых катэгорый насельніцтва. Змяненні датычацца аздараўлення і санаторна-курортнага лячэння. Цяпер, напрыклад, бясплатна яго могуць праходзіць беларусы, якія ваявалі ў Афганістане, а таксама былыя вязні фашызму. Некаторыя катэгорыі могуць скарыстацца кампенсацыяй, калі не пройдуць аздараўленне. Расказваем, што змянілася.



Як адзначыў **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай АРОЛ,** значна ўзмоцнены сацыяльныя гарантыі для ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, былых вязняў фашызму, некаторых катэгорый ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама мужоў і жонак загінулых ваеннаслужачых, якія не ўзялі новы шлюб.

У прыватнасці, шэраг ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны з ліку катэгорый асоб, узнагароджаных ордэнамі і медалямі за бездакорную воінскую службу ў тыле, прылічаны да ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і, адпаведна, атрымалі права на штогадовую дапамогу на аздараўленне. І ў выпадку, калі яны не скарысталіся на працягу года санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем, то змогуць па выніках года атрымаць дапамогу ў памеры 10 бюджэтаў пражытачнага мінімуму на аздараўленне.

Ветэраны баявых дзеянняў, значная катэгорыя якіх — гэта суайчыннікі, якія ваявалі ў Афганістане, атрымалі права на бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне. Такое ж права ёсць у былых вязняў фашызму — іх сёння каля 5,5 тысячы, а таксама ў мужоў ці жонак загінулых ваеннаслужачых, якія не ўзялі новы шлюб.

**Намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Аляксандр ЦАЙ** нагадаў новаўвядзенні, якія былі ўведзены ў мінулым годзе. У прыватнасці, калі дзеці сумесна з бацькамі накіроўваюцца на санаторна-курортнае лячэнне, то дзіцяці неабходна прад'явіць даведку аб адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў і наяўнасці медыцынскіх паказанняў да санкурлячэння, а бацькам, якія накіроўваюцца разам з дзіцем, — заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі.





Што датычыцца льготных катэгорый, Аляксандр Цай нагадаў, што абсалютна ўсе дзеці забяспечваюцца бясплатнымі пуцёўкамі на санаторна-курортнае лячэнне за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Гэта ж датычыцца Герояў Беларусі, інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, былых вязняў, ветэранаў, якія не працуюць, удзельнікаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, інвалідаў I і II груп. Працоўныя грамадзяне ў залежнасці ад грашовага даходу адносна сярэднямесячнай заработнай платы па краіне забяспечваюцца пуцёўкамі з частковай платай.

Грамадзяне, якія працуюць, могуць атрымаць пуцёўку ў камісіях па аздараўленні, створаных на прадпрыемствах. Тыя ж, хто не працуе, — у прадстаўніцтвах рэспубліканскага цэнтра па месцы жыхарства. Асноўныя дакументы, якія неабходна прад'явіць, — гэта даведка аб наяўнасці медыцынскіх паказанняў і адсутнасць медыцынскіх супрацьпаказанняў да санаторна-курортнага лячэння і заява, каб стаць на ўлік маючых патрэбу ў санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні і атрымаць пуцёўку. Для льготных катэгорый патрэбны таксама копіі дакументаў, якія пацвярджаюць права на льготу ў той ці іншай катэгорыі.

На цёплы перыяд попыт на адпачынак у беларускіх здраўніцах вельмі высокі. Актыўнае браніраванне летніх месяцаў пачалося ўжо са снежня 2024 года. Да красавіка каля 88-89 % месцаў было забраніравана. На сёння, паводле інфармацыі Аляксандра Цая, у санаторна-курортных арганізацыях выкуплена і забраніравана каля 95 % месцаў, але купіць пуцёўкі ўсё яшчэ можна. Глыбіня продажаў павялічвалася пасля ковідных гадоў. Каб купіць упадабаны нумар у патрэбны перыяд і на пэўную дату, браніраваць месцы варта прыкладна за тры месяцы.

Што датычыцца цаны пуцёвак, у другім квартале стандартны аднапакаёвы двухмесны нумар, як чакаецца, будзе каштаваць у сярэднім 127 рублёў за суткі, што прыкладна на 2 % вышэй, чым у снежні мінулага года. У летні перыяд у сувязі са значным павышэннем попыту кошт стандартнага нумара крыху падрасце і будзе трымацца ў межах 140 рублёў.

Асаблівую ўвагу павышэнню даступнасці пуцёвак для грамадзян удзяляюць уласнікі здраўніц. Укараняюцца акцыі, скідкі, бонусы, у прыватнасці пры раннім браніраванні. У якасці бонусаў бясплатна даюцца медыцынскія працэдуры, што таксама павышае попыт і дае магчымасць адпачывальнікам у санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацыях атрымаць дадатковыя паслугі. Акрамя таго, уласнікамі ведамасных санаторыяў для сваіх работнікаў і іх дзяцей робяцца добрыя зніжкі — даплачваецца ад 15 % да 90 % кошту пуцёўкі.

**Алена КРАВЕЦ.**

ЗАПРАШАЛЬНІК

# ЧЫМ ПАРАДУЕ «МАЛАДЗЕЧНА-2025»?

## Звыш 70 мерапрыемстваў, народныя традыцыі, юныя выканаўцы...

Завяршаецца падрыхтоўка да XXIV Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2025». Найбуйнейшы музычны форум нашай краіны пройдзе 13 і 14 чэрвеня, аднак мерапрыемствы ў горадзе стартуюць ужо 10-га. Па традыцыі асноўныя падзеі — Нацыянальны конкурс маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні і канцэрты адкрыцця і закрыцця фестывалю — пройдуць на галоўных сцэнічных пляцоўках Маладзечна. Акрамя гэтага запланавана яшчэ шмат цікавага. Карэспандэнт «Звязды» даведалася падрабязнасці.

Як расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Кацярына УСАВА,** увогуле адбудзецца больш за 70 мерапрыемстваў: «Праграма вельмі насычаная. Я думаю, госці любых узроставых катэгорый і інтарэсаў змогуць знайсці ў рамках фестывалю шмат цікавага. Асноўнае — гэта ўрачыстыя цырымоніі адкрыцця і закрыцця фестывалю. Абедзве падзеі пройдуць у Летнім амфітэатры. Таксама з галоўных мерапрыемстваў — Нацыянальны конкурс маладых выканаўцаў эстраднай песні. Мэта ўсяго фестывалю — падтрымка нашай таленавітай моладзі не проста ў эстрадным фармаце, а з пункту гледжання папулярызацыі беларускай музычнай творчасці».

По словах спікера, ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны прайшлі адборачныя туры конкурсу, у якіх паўдзельнічала звыш 145 чалавек. У фінальных мерапрыемствах для ўдзелу адабраны 20 выканаўцаў. Цяпер праходзяць сумесныя рэпетыцыі з Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестрам імя М. Я. Фінберга: «Менавіта гэтым калектывам праводзіцца вялікая работа з нашымі канкурсантамі. Вельмі ганарова і адказна адну з конкурсных песень выканаць у суправаджэнні славутага музычнага калектыву», — адзначыла Кацярына Валер'еўна.

Цырымоніі адкрыцця і закрыцця сёлета стануць вялікімі канцэртамі-прысвячэннямі выдатным беларускім музыкантам. На адкрыцці фестывалю ўспомняць вядомага беларускага кампазітара Алега Елісеенкава, чый творчы шлях і жыццё былі непарыўна звязаны з Маладзечна. Закрыццё форуму пройдзе ў суправаджэнні Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя І. Жыновіча і стане прысвячэннем Уладзіміру Мулявіну. Дарэчы, у наступным годзе будзе святкавацца юбілей славутага песняра. У рамках цырымоніі закрыцця адбудзецца і ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу».

**Начальнік галоўнага ўпраўлення культуры Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Ала ШАХОЦЬКА** паведаміла, што сёлета таксама адбудзецца фінал XI Адкрытага конкурсу юных выканаўцаў эстраднай песні «Маладзічок-2025»: «Упершыню нашы юныя таленты таксама выступяць з аркестрам імя Міхаіла Фінберга».

**Беларускі саюз кампазітараў у сваю чаргу ўжо трэці раз парадуе меламанаў канцэртам майстроў мастацтваў «Музыка беларускіх кампазітараў — пакаленню XXI стагоддзя», які адбудзецца 14 чэрвеня. Па словах старшыні Саюза кампазітараў Алены АТРАШКЕВІЧ, публіка пачуе творы акадэмічнай харавой музыкі духоўнай накіраванасці Алега Хадоскі, Дзмітрыя Далгалёва, Аліны Безенсон, Ігара Лучанка, Ганны Казловай. Адбудзецца прэм'ера твора «Дальва» кампазітара Леаніда Захлеўнага.**





На гэтым цікавосткі не заканчваюцца. Па вуліцы Прытыцкага ў цэнтры горада разгорнецца вялікі «Горад майстроў», дзе будзе шырока прадстаўлены культурны патэнцыял захавання народных традыцый дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва рамеснікаў Мінскай вобласці. Гасцей фестывалю як з іншых рэгіёнаў, так і з Расіі чакаюць унікальныя сувеніры, што ствараюць таленавітыя майстры Маладзечанскага краю.

Свае праекты на фестывалі рыхтуюцца прадставіць і творчыя саюзы краіны — Саюз пісьменнікаў Беларусі і Беларускі саюз кампазітараў. Адбудзецца прэзентацыя міжнароднага кніжнага праекта «Победили! Перамаглі!», прысвечанага 80-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Кніга ўяўляе сабой зборнік паэзіі, прозы і публіцыстыкі 72 аўтараў з Беларусі і Расіі. Як справядліва зазначыў **намеснік старшыні Мінскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Рагнед МАЛАХОЎСКІ,** без якаснай паэзіі не будзе якаснай песні. Ён таксама дадаў, што ў фестывалі возьме ўдзел больш за 30 членаў саюза.

«У 2021 годзе гэты праект падтрыманы грантам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Дастаткова паспяхова быў рэалізаваны ў розных пунктах Беларусі і знайшоў свайго адданага гледача, — дадала старшыня Беларускага саюза кампазітараў Алена Атрашкевіч. — Залы заўсёды запоўненыя. Увага да яго каласальная. Мы рады, што побач з песеннай музыкай на фестывалі гучыць і харавая, якую выконваюць маладыя калектывы».

Знакавай стала навіна, што ў 2027 годзе горад Маладзечна аб'яўлены культурнай сталіцай СНД. Гэта накладзе свой адбітак на правядзенне юбілейнага фестывалю ў Маладзечне і ў будучыні, у 2026 годзе.

**Яна ВАЛАСАЧ.**

## АД ГЛАБАЛЬНЫХ ТРЭНДАЎ ДА ПРАКТЫЧНЫХ РАШЭННЯЎ

### У Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень» прайшло мерапрыемства #GreatBusinessDay

Тэма чарговай сустрэчы — «Тэндэнцыі і выклікі — бізнес-клімат у эпоху магчымасцяў», паведамілі ў прэс-службе парка.

Мерапрыемства сабрала прадстаўнікоў бізнесу, стартапаў і экспертаў для абмеркавання ключавых трэндаў і выклікаў сучаснага дзелавога клімату. Прадстаўнікі дзелавых колаў разгледзелі міжнародныя тэндэнцыі ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, Цэнтральнай Азіі і на Каўказе, разабралі практычныя кейсы трансфармацыі бізнесу і прааналізавалі змены ў падатковым і прававым асяроддзі.




У рамках практычнай сесіі ўдзельнікі абмеркавалі ролю стартапаў і механізмаў іх падтрымкі.

## ПЛЮС ДА КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦІ

### У ААТ «Гомельшкло» рэалізуюць інвестыцыйны праект па вытворчасці паліраванага шкла



Міністр архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр Студнеў наведаў ААТ «Гомельшкло», паведамілі ў ведамстве. Кіраўнік галіны азнаёміўся з работай тэхналагічнай лініі № 2 па вытворчасці паліраванага шкла. Будаўніцтва лініі — гэта завяршальны этап інвестыцыйнага праекта па мадэрнізацыі абсталявання.

Напярэдадні адбыўся запуск газу ў шклаварную печ тэхналагічнай лініі. Найноўшая печ з аўтаматызаваным кіраваннем валодае канструктыўнымі асаблівасцямі, якія забяспечваюць эканамічны рэжым работы і эфектыўнае выкарыстанне цяпла.

Чакаецца, што ў жніўні прадпрыемства атрымае першае шкло. Увод тэхналагічнай лініі, якая з'яўляецца адной з самых сучасных у свеце, значна павысіць эфектыўнасць вытворчасці і ўмацуе пазіцыі ААТ «Гомельшкло» на міжнародным рынку, дазволіць паспяхова канкурыраваць з еўрапейскімі вытворцамі.

## МЭТА: ПАВЕЛІЧЭННЕ ТАВАРААБАРОТУ

### Днямі старшыня БелГПП Міхаіл Мятлікаў сустрэўся з міністрам сельскай гаспадаркі, лясных і водных рэсурсаў Рэспублікі Сербскай Босніі і Герцагавіны Сава Мінічам

Бакі абмеркавалі перспектывы двухбаковага супрацоўніцтва, пункты ўзаемадзеяння бізнес-супольнасцяў, паведамілі ў прэс-службе БелГПП.

— Мы выступаем з прапановай заключыць з Гандлёва-прамысловай палатай Рэспублікі Сербскай пагадненне аб супрацоўніцтве і запрашаем наведаць Беларусь разам з дэлегацыяй дзелавых колаў Рэспублікі Сербскай. Упэўнены, што падпісанне пагаднення надасць новы імпульс развіццю двухбаковага дзелавога супрацоўніцтва не толькі паміж нашымі палатамі, але і дзелавымі коламі дзвюх краін у цэлым, — падкрэсліў Міхаіл Мятлікаў.

Адзначым, што за 2024 год тавараабарот паміж Беларуссю і Рэспублікай Сербскай склаў 6,3 мільёна, экспарт — 2,6 мільёна, імпарт — 3,7 мільёна долараў.

Паміж арганізацыямі сістэмы БелГПП і бізнес-структурамі Босніі і Герцагавіны дзейнічае шэраг дамоўленасцяў. Напрыклад, заключаны Мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам сельскай гаспадаркі, лясных і водных рэсурсаў Рэспублікі Сербскай і Міністэрствам прамысловасці Рэспублікі Беларусь. У 2024 годзе ў Рэспубліку Сербскую быў прададзены 161 трактар маркі «Беларус».

Бізнес-супольнасць Рэспублікі Сербскай Босніі і Герцагавіны мае вялікую цікавасць да прадукцыі прамысловасці, сельскай гаспадаркі Беларусі. У рамках заключанага мемарандума прапрацоўваецца пытанне аб другім тэндары на трактар «Беларус» з прадастаўленнем ільгот пакупнікам.

## ПЕРШЫЯ ГРОШЫ

### Як зарабіць падлетку летам?

Простыя правілы для тых, хто хоча падзарабіць у вольны ад вучобы час, расказалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

У ведамстве нагадалі, што працаваць можна з 14 гадоў, але з пісьмовай згоды аднаго з бацькоў. З 16-ці — такое рашэнне можна прымаць самастойна.

Для падлеткаў прадугледжана скарочаная працягласць працоўнага часу.

Так, хлопцам і дзяўчатам ад 14 да 16 гадоў дазваляецца працаваць не больш за 23 гадзіны на тыдзень (падчас канікул — не больш за 4 гадзіны 36 хвілін на дзень і толькі лёгкія працоўныя задачы); ад 16 да 18 гадоў — не больш за 35 гадзін (падчас канікул — 7).

Акрамя таго, забаронена прыцягваць дзяцей да начных і звышурочных, работ у святочныя і выхадныя дні.



У Мінпрацы дадалі, што ўсе, хто маладзейшы за 18 гадоў, прымаюцца на работу толькі пасля медагляду.

Што датычыцца заробкаў, памер налічанай заработнай платы за цалкам адпрацаваны месяц не павінен быць меншы за мінімальную заработную плату — 726 рублёў.

## МЕСЦА СУСТРЭЧЫ ДЗЕЛАВЫХ ЛЮДЗЕЙ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Вядома, як і ў любым бізнесе за дзелавых людзей канкурыравалі шмат якія дзяржавы. Але шанцы атрымаць сваю долю ў гэтай нішы ў нас былі. І цалкам рэальныя. Больш за тое, зрухі ў гэтым кірунку ўжо назіраліся. І дастаткова дынамічныя. Зблыталі карты ковід і напружанасць міжнароднага становішча, якая здарылася хутка пасля пандэміі. Зрэшты, нягледзячы на змену навакольнага асяроддзя, канкурэнтныя перавагі ў сегменце дзелавога турызму, мабыць, толькі ўзмацніліся.**



Рыторыка з усіх бакоў гучыць дастаткова ваяўнічая. Часам нават непрымірымая. Эканамічнае супрацоўніцтва Усходу і Захаду знаходзіцца, мякка кажучы, не на самым высокім узроўні. Алею ў агонь дадаў і Дональд Трамп, дэкларуючы масіраваную палітыку пошлін і падштурхоўваючы сусветную эканоміку да гандлёвых войн. Альбо як мінімум да гандлёвага супрацьстаяння. Зрэшты, палітыка — палітыкай, санкцыі — санкцыямі, але дзелавыя кантакты працягваюць захоўвацца. Так, яны сталі менш публічнымі. Згодны, што часта яны маюць нефармальны характар. Але калі іншы раз узаемадзеянне пастаўлена на паўзу ў сілу асаблівасцяў сучаснай міжнароднай абстаноўкі, то кантакты прадпрымальнікаў, фінансістаў, экспертаў, навуковых колаў цалкам не зніклі. І людзі па розныя бакі тэктанічнага геапалітычнага разлому працягваюць камунікаваць.

Найноўшыя камунікацыйныя тэхналогіі, вядома, робяць цуды дазваляючы вырашаць пытанні на любой адлегласці, без асабістых сустрэч. Але сярод пераваг электронных гаджэтаў ёсць адна вельмі істотная загана — яны змяншаюць узровень канфідэнцыяльнасці, якая сёння ў бізнесе як ніколі важная. Самы бяскрыўдны дыялог, падслуханы, вырваны з кантэксту, можа імгненна быць занадта прадузята вытлумачаны. А наколькі распаўсюджаныя месенджары ўмеюць захоўваць таямніцу, а сусветныя камунікацыі абаронены ад нясціплых вачэй і вушэй — пытанне вельмі дыскусійнае. Таму сёння ў шэрагу выпадкаў лепш не рызыкаваць і пагаварыць асабіста, адзін на адзін. І, як бачыцца, Беларусь для такіх сустрэч цалкам прыдатнае месца.

З дзяржавамі ў рамках ЕАЭС і СНД у нас граніца ўвогуле адкрытая. Прыехаць у Мінск прасцей простага: не трэба ні візы, ні нейкіх іншых спецыяльных дазволаў. Як бы да Беларусі ні ставіліся краіны еўрапейскага Захаду, але граніца ў нас не перакрытая. Больш за тое, дзейнічае бязвізавы рэжым. Таму для грамадзян Прыбалтыкі, Германіі ці Польшчы, многіх іншых дзяржаў адсутнічаюць нейкія бар'еры для прыезду ў Беларусь. Іншае пытанне, што з-за розных санкцыйных гісторый і ўзброенага канфлікту ва Украіне некалькі мудрагеліста выглядае транспартная лагістыка. З вядомых прычын прамых авіяцыйных і чыгуначных зносін паміж Мінскам і еўрапейскімі сталіцамі няма. Аднак застаюцца крыху даўжэйшыя, але цалкам даступныя абходныя шляхі праз Стамбул, напрыклад. Або Дубай.

Турцыя і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты ў сілу міжнароднай абстаноўкі ўзмацнілі свае пазіцыі буйных лагістычных хабаў. І дзелавы турызм у гэтых дзяржавах таксама, будзем аб'ектыўнымі, развіты нядрэнна. Нямала сустрэч і кантактаў адбываецца менавіта ў згаданых краінах. Але гэта зусім не значыць, што ў нас няма шанцаў. Іншая справа, што пытанне неабходна ўважліва і дасканала вывучыць, знайсці ў сегменце дзелавога турызму нішы, у якіх у нас могуць быць якасныя прапановы, сфарміраваць адпаведныя прадукты і прапаноўваць, рэкламаваць іх. Адкінуўшы ілюзіі, што прадстаўнікі бізнес-колаў самі паедуць да нас. Безумоўна, адукаваныя людзі ведаюць, дзе на карце свету размешчаны Мінск. І нейкая колькасць можа прыехаць па ўласнай ініцыятыве. Але каб гэты кірунак стаў адным з драйвераў росту турыстычнай галіны, неабходна прыкласці пэўныя намаганні. Перш за ўсё на ўзроўні камерцыйных кампаній з гэтай сферы. Са свайго боку дзяржава робіць дастаткова шмат, каб у нашых гасцей не ўзнікала перашкод для ўезду ў краіну. Зрэшты, перакананы: калі высвеліцца, што неабходны нейкія дадатковыя меры падтрымкі, то дадзенае пытанне можа быць вырашана дастаткова аператыўна. Калі, вядома, будзе адпаведнае абгрунтаванне, аб'ектыўнае і адэкватнае ў межах існуючых рэалій.



**Інтэлект ШТУЧНЫ**


**БЕЛАРУСБАНК**

**ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона по продаже объекта недвижимого имущества методом повышения начальной цены (шаг – 10 %):**

| № объекта | Характеристика имущества | Местонахождение имущества | Начальная цена |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (назначение: помещение финансового назначения; наименование: изолированное помещение № 3) с инвентарным номером 255/D-14825, общей площадью 172,9 кв. м | Витебская обл., Браславский р-н, г. Браслав, ул. Октября, 1-3 | 70 377,59 (Семьдесят тысяч триста семьдесят семь белорусских рублей 59 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 11 729,60 |

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

**Заявление на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1 в срок до 16.00, в пятницу до 15.00 по 08.07.2025.**

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота в срок до 12.00 08.07.2025 на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

**Аукцион состоится 10.07.2025 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.**

Особые условия: победителем аукциона либо единственным участником возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ. Дополнительно победитель аукциона либо единственный участник приобретает имущество по стоимости 631,51 руб. (в т. ч. НДС 20 %): жалюзи вертик. тканевые 1,60*3,18 (инв. номер М600254), жалюзи рулонные тканевые мини 1,80*3,18 (инв. номер М600255), жалюзи вертик. тканевые 2,82*3,18 (инв. номер М600256), жалюзи рулонные тканевые мини 1,80*3,18 (инв. номер М600293), жалюзи вертик. тканевые 2,82*3,18 (инв. номер М6003006), жалюзи вертик. тканевые 1,80*3,18 (инв. номер М604841), стенд – Пожарная безопасность (инв. номер 214010020509830), стол президиума (инв. номер 214010205003724), трибуна (инв. номер 214010205003725).

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения.

Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

**Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8 (029) 309-42-19**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Унитарное предприятие «Слуцкий рынок ОПС», Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пл. Базарная, д. 13. УНП 691522554 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронных торгов**

**Склад – 829,5 кв. м** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. № 640/С-59617). Адрес: **Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, пер. Железнодорожный 3-й, 12**

***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1973** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 24.05.2030) для содержания и обслуживания здания склада

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 261 600,00 бел. руб.**

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати)** календарных дней после подписания договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 4 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 08.07.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 07.07.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества**

| Организатор аукциона | **Открытое акционерное общество «Солигорскторг», г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44** | |
|---|---|---|
| Дата, время и место проведения аукциона | **16.06.2025, 11.00, актовый зал ОАО «Солигорскторг»** | |
| | **Лот № 1** | **Лот № 2** |
| Предмет аукциона | Право заключения договора аренды недвижимого имущества – части капитального строения с инвентарным номером 644/С-38252 | Право заключения договора аренды недвижимого имущества – части капитального строения с инвентарным номером 644/С-3244 |
| Общая площадь, кв. м | 173,3 | 270,0 |
| Местонахождение недвижимого имущества | Минская область, г. Солигорск, ул. Ленина, 41 | Минская область, г. Солигорск, ул. Ленина, 39, 2-й этаж |
| Характеристика недвижимого имущества и иные сведения | Оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроснабжением, канализацией, охранной сигнализацией, имеются складские помещения, подъездные пути, отдельный вход | Оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроснабжением, канализацией, охранной сигнализацией |
| Условия аукциона | Целевое использование имущества – организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения офиса, детского развлекательного центра (аттракционов), оказания услуг, розничной торговли непродовольственными товарами, кроме бывших в употреблении и ритуального назначения; за исключением размещения игорных заведений и аптек | Целевое использование имущества – организация деятельности в соответствии с законодательством Республики Беларусь, санитарными нормами и противопожарными требованиями, для размещения развлекательного объекта для досуга детей |
| Начальная цена права заключения договора аренды объекта, руб. | 569,25 | 886,88 |
| Сумма задатка, руб. | 569,25 | 886,88 |
| Срок договора аренды | 5 лет | 3 года |
| Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы, устанавливаемый арендодателем или размер арендной платы | 3 (три) | 3 (три) |
| Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона в предусмотренных законодательством случаях, руб. | 4 200,00 | 4 200,00 |

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44, финансовый отдел, с 8.00 до 16.00 по рабочим дням по 13 июня 2025 г. включительно,** телефоны: **8 (0174) 26 07 31, 23 65 26.**
Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – **www.gki.gov.by (https://au.nca.by),** Солигорского районного исполнительного комитета – **www.soligorsk.gov.by** (Главная/Экономика и бизнес/Инвестору/Аукционы), открытого акционерного общества «Солигорскторг» – **www.soligorsktorg.by** (Главная/Аукционы)

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Пружанский молочный комбинат», Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Горина-Коляды, д. 26, УНП 200027027 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов**

**Грузовой специальный фургон-рефрижератор MAZ 5731, AA 5662-1,** 2007 г. в.
Местонахождение: Брестская область, г. Пружаны, ул. Горина-Коляды, д. 26.
**Начальная цена с НДС 20 % – 16 920,00 бел. руб.**
Шаг аукциона: **5 %** от текущей цены

Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** 100 % оплата стоимости в течение **10 (десяти) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов **затраты** на их проведение и оплатить **вознаграждение 6 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 08.07.2025 с 11.00 до 12.00**.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 07.07.2025 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **+375 17-310-36-37; +375 (29)-154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «БЕЛАЗ-СЕРВИС», 222160, Минская обл., г. Жодино, ул. Брестская, 31, тел. +375 177558884 |

**Предмет электронных торгов (б/у), расположенные по адресу: Минская обл., г. Жодино, ул. Брестская, 31**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Грузовой пикап VOLKSWAGEN AMAROK DELIVERY, 2012 г. в., рег. № АК 9308-5, № кузова WV1ZZZ2HZCA034323 | **47 628,00** |
| 2 | Автомат для зачистки углов WP-OF 1F, 2008 г. в., инв. № 10398 | **1 440,00** |
| **Предмет электронных торгов: спецтехника (б/у), расположенная по адресу: Брестская обл., г. Микашевичи, ул. Привокзальная, 2/2** | | |
| 3 | Карьерный самосвал БЕЛАЗ-7555Н (VIN 7555HKG0002737, 2016 г. в., инв. № 10686 | **636 000,00** |
| 4 | Карьерный самосвал БЕЛАЗ-7555Е (VIN Y3B7555EJE0002578, 2014 г. в., инв. № 10530 | **267 600,00** |
| 5 | Карьерный самосвал БЕЛАЗ-7555Е (VIN Y3B7555ELF0002684), 2015 г. в., инв. № 10535 | **360 000,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется участником электронных торгов в белорусских рублях на счет BY92BELB3012 0048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от **3–10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов (точная сумма затрат и установленный процент вознаграждения указаны на ЭТП «ИПМ-Торги» www.ipmtorgi.by)

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 12.03.2025 г. (по лоту № 1) и от 23.01.2025 г. в газете «Звязда» (по лотам №№ 2–5)

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 26.06.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **25.06.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена (без НДС), бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Квартира,** общ. пл. 105,3 кв. м, инв. № 500/D-7988236244, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-65 | 389 600,00 |
| 2 | **Квартира,** общ. пл. 81,1 кв. м, инв. № 500/D-7988236248, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-75 | 315 800,00 |
| 3 | **Квартира,** общ. пл. 81,3 кв. м, инв. № 500/D-7988236249, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-82 | 316 600,00 |
| 4 | **Квартира,** общ. пл. 91,9 кв. м, инв. № 500/D-7988236250, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-85 | 357 900,00 |
| 5 | **Квартира,** общ. пл. 81,1 кв. м, инв. № 500/D-7988236252, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-89 | 315 800,00 |
| 6 | **Квартира,** общ. пл. 91,8 кв. м, инв. № 500/D-7988236253, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-92 | 357 500,00 |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by.
Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона по всем лотам

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) календарных дней** с даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано газете «Звязда» от 20.05.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 16.06.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 13.06.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**




# Мы разам — Беларусь!



## Краіна моцная рэгіёнамі: Мазырскі раён

# ВЫСОКІ ПАТЭНЦЫЯЛ І АДЧУВАЛЬНЫЯ ВЫНІКІ

### Як жыхары з берагоў Прыпяці забяспечваюць устойлівы рост свайго рэгіёна

**Адразу восем прадпрыемстваў Мазырскага раёна ўдастоіліся занясення на абласную Дошку гонару па выніках спаборніцтва па сацыяльна-эканамічным развіцці за 2024 год. І гэта, сапраўды, знакава: Мазыршчына аказвае важкі ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё не толькі Гомельскай вобласці, але і краіны ў цэлым. Між тым раён штогод ставіць перад сабой усё больш складаныя задачы, шукае новыя кропкі росту, якія дазволяць вывесці яго эканоміку, а як вынік і сацыяльную сферу — на новы ўзровень.**

## КУРС НА РАЗВІЦЦЁ

Як звяртае ўвагу **старшыня Мазырскага раённага выканаўчага камітэта Алена ПАЎЛЕЧКА**, менавіта на Мазыршчыне — адным з самых буйных прамысловых раёнаў Гомельскай вобласці — дзейнічаюць прадпрыемствы, якія прадстаўляюць практычна ўсе галіны народнай гаспадаркі: нафтаперапрацоўку, вытворчасць малочных і мясных прадуктаў, солі, машын і абсталявання, кабеляў, швейных вырабаў...

— У аб'ёме прамысловай вытворчасці Гомельскай вобласці доля Мазырскага раёна складае больш за 40 %. Гэта важкі паказчык, але, вядома, мы не спыняемся на дасягнутым, рухаемся наперад, — падкрэслівае Алена Паўлечка. — Ад сельскай гаспадаркі да прамысловасці, будаўніцтва, гандлю, сацыяльнай сферы... Усюды мы павінны прырастаць і ствараць камфортныя ўмовы для развіцця нашых прадпрыемстваў і арганізацый.

Кіраўнік раёна перакanana, што трымаць высокую планку раёну шмат у чым дапамагае зладжаная сумесная работа выканаўчай улады, кіраўнікоў прадпрыемстваў, устаноў, працоўных калектываў і жыхароў раёна ў цэлым.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

— Вялікую ўвагу ўдзяляем рэалізацыі інвестпраектаў і інвестпраграм ва ўсіх галінах гаспадарання. У мінулым годзе было накiравана больш за 656 мільёнаў рублёў інвестыцый. Асноўны іх аб'ём укладзены ў знакавы праект рэспубліканскага ўзроўню — рэканструкцыю моста цераз раку Прыпяць — самага доўгага ў краіне. На гэты аб'ект накіроўваюцца значныя сродкі рэспубліканскага бюджэту. Праект стартаваў у канцы 2023 года, а завяршыць яго плануецца ўжо восенню. І гэта будзе не проста найважнейшы аб'ект, які злучае два берагі ракі, а сапраўднае ўпрыгажэнне набярэжнай Мазыра і ўсяго горада, — звяртае ўвагу старшыня райвыканкама.




## АСНОВЫ ДЛЯ РОСТУ

У прамысловым сегменце чарговы маштабны інвестыцыйны праект па вытворчасці прапілену і поліпрапілену рэалізоўвае Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод. Гэты доўгатэрміновы праект прынясе і дадатковыя працоўныя месцы, і паглыбленне ў працэсы нафтахіміі, і імпартазамяшчэнне, і пашырэнне экспарту.

Мадэрнізацыя, рэканструкцыя, тэхнічнае пераабсталяванне, адкрыццё новых ліній таксама працягваюцца на іншых прамысловых прадпрыемствах Мазыршчыны. Традыцыйна значная ўвага — інвестыцыйным праектам у сельскай гаспадарцы. У 2024 годзе ўведзены два жывёлагадоўчыя аб'екты ў Мазырскім раёне і адзін — у Нараўлянскім. Гэта малочнатаварныя фермы, якія ўжо запоўнены пагалоўем цялушак, што дало адчувальны дадатак да аб'ёму вытворчасці малака.

— Па выніках мінулага года Мазырскі раён заняў 6-е месца ў краіне па прадукцыйнасці малочнага статка, Нараўлянскі — 25-е сярод 118 раёнаў. Паводле даных за першы квартал 2025-га, Мазырскі раён ужо на 5-м месцы, а Нараўлянскі — на 20-м. Гэта пацвярджае, што мы рухаемся ў патрэбным напрамку.

Рэнтабельнасць рэалізацыі малака складае больш за 28 %, і гэта вельмі добры патэнцыял, — падкрэслівае Алена Паўлечка.

## ЛІДАРЫ Ў БУДАЎНІЦТВЕ

У вёсцы Рудня Мазырскага раёна сёння важны праект па будаўніцтве новага малочнатаварнага комплексу рэалізоўвае «Саўгас-камбінат «Зара». Акрамя таго, для кожнага сельгаспрадпрыемства Мазыршчыны ставіцца задача — штогод узводзіць як мінімум адно памяшканне для ўтрымання буйной рагатай жывёлы. І гэта заўсёды паспяхова рэалізоўваецца.

— Таксама ў аграсектары мы абнаўляем інфраструктуру, — дадае кіраўнік раёна. — Штогод на 10 % папаўняем машынна-трактарны парк, набываем новую тэхніку і абсталяванне, што дае магчымасць выконваць тэхналогіі і дабівацца высокіх вынікаў.

Алена Фёдараўна звяртае ўвагу: сёння на Мазыршчыне сапраўды будаўнічы бум.

— Прыярытэтны кірунак — будаўніцтва жылля: запланавана ўвядзенне больш як 75 000 квадратных метраў. Узводзіцца жыллё як для тых, хто стаіць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, так і для тых, хто гатовы ўдзельнічаць на камерцыйнай аснове праз упраўленне капітальнага будаўніцтва. Вядзём у тым ліку ўшчыльняльную забудову: у цэнтры Мазыра на месцы прыватнага сектара ўжо рэалізуюцца новыя праекты. З насельніцтвам праводзіцца работа, кампенсацыя ажыццяўляецца раўназначным жыллём у зручных мікрараёнах, — тлумачыць суразмоўца.



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Сёння ў Мазыры вялікія сродкі накіроўваюцца і на аднаўленне важных аб'ектаў інфраструктуры: замяняюцца цеплатрасы, водаправодныя сеткі. Праводзіцца капітальны рамонт больш за 55 000 квадратных метраў жыллёвага фонду.

У горадзе будуюцца новыя аб`екты ў сферы гандлю. Толькі гэтай вясной адкрыліся два буйныя гандлёвыя цэнтры па продажы будаўнічых матэрыялаў, на чарзе трэці — «Глобал».

## БІЗНЕС-ВЕКТАР

Між тым сёння каля 68 % прадукцыі прамысловага сектара Мазыршчыны ідзе на экспарт. Экспартны патэнцыял Мазырскага раёна ў асноўным арыентаваны на расійскі рынак. У Расійскую Федэрацыю экспартуюцца соль, прадукцыя нафтахіміі, апрацаваная драўніна, пліты ДВП і ДСП, ламінат і іншая прадукцыя. Актыўна Мазыршчына развівае дзелавыя кантакты з Кітайскай Народнай Рэспублікай: пастаўляецца сухое малако, адпрацоўваюцца пастаўкі тварожнай і мясной прадукцыі. Свой вектар развіцця экспарту склаўся з Казахстанам і Узбекістанам — гэта напрамак машынабудавання.

— Удзельнічаем у бізнес-выставах, запрашаем да нас у раён партнёраў, абмяркоўваем тэхналогіі і тыя тавары ды паслугі, якія можа прадаставіць Мазыршчына. Увогуле мы заўсёды імкнёмся своечасова заняць новыя рыначныя нішы, бо ўсё, што зроблена на прадпрыемствах Мазыра, — гэта высокай якасці прадукцыя, якую даўно ведаюць не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і за яе межамі, — падкрэслівае Алена Паўлечка.

# ТАЛЕНТ СТВАРАЦЬ

### Архітэктура поўдня Беларусі нараджаецца з чарцяжоў «Інстытута «Палессепраект»

**Мазыр сёння пазнаюць па новых мікрараёнах, сучасных школах, парках, спартыўных базах... І за кожным з гэтых адметных аб'ектаў стаіць праект. А за праектам — каманда прафесіяналаў. Работа праектна-вышукальнага ўнітарнага прадпрыемства «Інстытут «Палессепраект» ААТ «Палессебуд» — прыклад таго, як інжынерная школа Беларусі захоўвае найлепшыя традыцыі і пры гэтым упэўнена глядзіць у будучыню.**




Дырэктар Ігар МАМАСУЕЎ.

Гісторыя «Палессепраекта» пачынаецца адразу пасля вайны — 3 ліпеня 1945 года. Тады ў Мазыры з'явілася праектнае бюро. Працавалі над аднаўленнем разбуранага горада, пасля праектавалі ўжо жылыя кварталы, школы, прамысловыя зоны, інжынерную інфраструктуру.

Архітэктурнае аблічча Мазыра, якім мы яго ведаем, — гэта, у тым ліку, работа праекціроўшчыкаў інстытута. У 1966 годзе пачынаецца будаўніцтва Мазырскага НПЗ, услед за ім — іншых індустрыяльных гігантаў. Горад расце ўдвая, а з ім — і праектны інстытут.

У 1980-х і 1990-х «Палессепраект» прымае выклік часу — удзельнічае ў ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС. Нават у цяжкія 1990-я гады калектыў працягваў праектаваць, знаходзілі рэсурс для работы на перспектыву.

Інстытут стаў аўтарам шэрагу аб'ектаў, значных не толькі для горада, але і для ўсёй Гомельшчыны: будынка музейнай экспазіцыі ў Тураве, гарналыжнага комплексу «Мазыр», музейнага комплексу на Замкавай гары, вяслярнай базы, сярэдняй школы № 16, дзіцячага садка на 300 месцаў у Мазыры, цэнтральнага парка ў Хойніках і Палаца культуры БМЗ у Жлобіне. Сярод рэалізаваных праектаў інстытута — рэканструкцыя Мазырскага драмтэатра імя Івана Мележа, басейна СДЮШАР № 2, дзіцячага садка па завулку 1-ы Бярозавы на месцы былога навучальнага корпуса Мазырскага дзяржпедуніверсітэта імя І. П. Шамякіна, рэканструкцыя Азарыцкага псіханеўралагічнага дома-інтэрната для састарэлых і інвалідаў у Калінкавіцкім раёне і многія іншыя.

Сёння «Інстытут «Палессепраект» — адзінае прадпрыемства поўдня Гомельскай вобласці, якое забяспечвае поўны цыкл праектна-вышукальных работ. Тут працуюць архітэктары, інжынеры-канструктары, геадэзісты, геолагі, спецыялісты па каштарысе, эколагі. Усё — ад тапаграфічных здымак і інжынерных пошукаў да аўтарскага нагляду — выконваецца адной камандай.

— Мазыр — адзін з нямногіх гарадоў Беларусі, дзе захаваўся ўласны праектны інстытут. І практычна адзіны ў рэгіёне, здольны распрацоўваць дакументацыю на аб'екты 1—4 класаў складанасці. Праекты, якія ствараюцца ў «Палессепраекце», — гэта не толькі жылыя дамы, але і сацыяльныя аб'екты, транспартная і інжынерная інфраструктура, — звяртае ўвагу **дырэктар інстытута Ігар МАМАСУЕЎ.**

У «Палессепраекце» вераць у комплексны падыход: праект — гэта не чарцёж, а адказ на выклік часу, рашэнне задачы асяроддзя. Таму і цэняць у калектыве не проста адукацыю, а здольнасць думаць маштабна, бачыць сувязі, браць на сябе адказнасць. Таму і застаюцца таленавітыя спецыялісты тут надоўга — нягледзячы на прапановы са сталіцы.

У «Палессепраекце» дасведчаныя спецыялісты працуюць побач з маладымі праекціроўшчыкамі, што толькі пачынаюць шлях. Майстры перадаюць не толькі веды, але і падыход да прафесіі.

— Каб захаваць школу, трэба ўкладвацца ў людзей, — перакананы Ігар Мамасуеў. — Для захавання тэмпу развіцця неабходна правільна спалучаць досвед і наватарства. Важна перадаць існуючы вопыт маладому пакаленню. Мы дапамагаем спецыялістам-пачаткоўцам адаптавацца, аказваем прафесійную падтрымку. Прапануем эфектыўныя сістэмы матывацыі: годную зарплату, навучанне, медыцынскае страхаванне і магчымасць рэалізаваць сябе ў прафесіі.

Сёння ўпэўнена можна казаць, што архітэктура будучыні поўдня Беларусі пачынаецца з чарцяжоў «Палессепраекта». Па выніках сацыяльна-эканамічнай дзейнасці ў 2024 годзе прадпрыемства занесена на Дошку гонару Гомельскай вобласці. Бягучы год для інстытута таксама вельмі насычаны: тут распрацоўваюць праект рэканструкцыі Палаца культуры Мазырскага НПЗ. Асаблівая ўвага ўдзяляецца развіццю мікрараёна Нафтабудаўнікоў — аднаго з самых амбіцыйных архітэктурных праектаў горада. Тут трэба будзе ўзвесці цэлы жылы масіў, школы, дзіцячыя садкі, аб'екты інфраструктуры — і ўсё гэта распрацоўваюць мазырскія праекціроўшчыкі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 491199000



Калектыў архітэктурна-будаўнічай брыгады № 3. Злева направа: архітэктар Таццяна КАЛАЦЕЙ, начальнік групы эколагаў Марыя КАВАЛЬЧУК, архітэктары Анастасія ЮНІЦКАЯ, Ганна ПЕСТУНОВА, інжынеры-канструктары Юлія ГУД, Таццяна ТРЫШЫНА, Максім ТАРАНУХА, галоўны інжынер праекта — кіраўнік АКБ № 3 Дзмітрый РЭУТ, галоўны архітэктар праекта Віктар ПАЛЯШЧУК, вядучы інжынер-канструктар Таццяна ТАРАНУХА, начальнік групы канструктараў Дзіяна КАВАЛЕНКА, інжынер-канструктар Аляксандра КНЮКШТА, начальнік групы архітэктараў Валерыя ЧУМАКОВА.

# САНІТАРНЫ ШЧЫТ прыпяцкага Палесся

### Якія задачы вырашаюць спецыялісты аднаго з самых эфектыўных цэнтраў гігіены краіны



Фота Наталлі КАПРЫЛЕНКІ.

Намеснік галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Мазырскага раёна Марына ХУДАЛЕЕВА.

**Работа Мазырскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі ў 2024 годзе атрымала высокую дзяржаўную ацэнку. Установа прызнана адной з пераможцаў штогадовага спаборніцтва па сацыяльна-эканамічным развіцці і занесена на абласную Дошку гонару. І гэта далёка не першае прызнанне: цэнтр неаднаразова станавіўся лідарам сярод устаноў сваёй катэгорыі ў Гомельскай вобласці.**



Галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Мазырскага раёна Сяргей ТАЛЕЦКІ.



Урач-лабарант санаторна-гігіенічнай лабараторыі Юлія СІЦКО праводзіць даследаванні вады паверхневых вадаёмаў.

Санітарна-эпідэміялагічнай службе Мазыршчыны сёлета спаўняецца 88 гадоў. Яе гісторыя пачалася ў 1937-м са стварэння Палескай абласной санэпідслужбы на базе супрацьмалярыйнай станцыі. Аднак вытокі гэтай дзейнасці сыходзяць у XIX стагоддзе, задаўга да фарміравання галіны ў складзе савецкай сістэмы аховы здароўя. Змяніліся пакаленні спецыялістаў, абнавілася тэхнічнае абсталяванне, але сутнасць засталася той жа: служэнне людзям і краіне, ахова грамадскага здароўя.

У цэнтры беражліва захоўваецца памяць аб унёску папярэднікаў. Ва ўстанове дзейнічае музейная экспазіцыя, дзе сабраны архіўныя дакументы, у тым ліку тыя, што адносяцца да 1940-х гадоў. Гэта не проста сведчанні гісторыі — гэта жывая сувязь пакаленняў.

— У нас моцная каманда спецыялістаў, гатовых да вырашэння любых задач у сферы аховы здароўя і якасці жыцця, — падкрэслівае **галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Мазырскага раёна Сяргей ТАЛЕЦКІ.**

Цэнтр размяшчаецца ў двух адміністрацыйных будынках, дзе працуюць аддзелы гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя. Адзін з найбуйнейшых —лабараторны аддзел. Тут працуюць больш за 50 спецыялістаў. У яго структуру ўваходзяць мікрабіялагічная лабараторыя з аддзяленнем ПЛР, а таксама лабараторыя санітарна-хімічных і таксікалагічных метадаў выпрабаванняў. Праводзяцца даследаванні паветра, вады, глебы, харчовай і нехарчовай прадукцыі, дэзсродкаў. Цэнтр забяспечвае лабараторнае суправаджэнне не толькі Мазырскага, але і Калінкавіцкага, Ельскага, Нараўлянскага, Лельчыцкага, Жыткавіцкага і Петрыкаўскага раёнаў.

Сярод ключавых кірункаў работы — прафілактыка захворванняў і санітарны нагляд. Пад кантролем спецыялістаў — звыш 1300 аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання, устаноў адукацыі, прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Цэнтр актыўна ўзаемадзейнічае з установамі аховы здароўя раёна, сочыць за бяспекай медыцынскіх паслуг і ўмовамі аказання меддапамогі.

— Важнае месца ў рабоце займае асветніцкая дзейнасць, — звяртае ўвагу **намеснік галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Мазырскага раёна Марына ХУДАЛЕЕВА.** — Нашы спецыялісты ідуць у калектывы, ва ўстановы адукацыі, расказваюць аб важнасці асабістай адказнасці за здароўе.

Асаблівая ўвага — дзецям. З 2016 года ў раёне рэалізоўваецца праект «Школа — тэрыторыя здароўя», накіраваны на стварэнне здаровага асяроддзя, умацаванне фізічнага развіцця і фарміраванне правільных звычак.

Мазырскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі актыўна падтрымлівае сацыяльна-значныя праекты для жыхароў раёна. Так, летась пры падтрымцы цэнтра ў сярэдняй школе № 9 Мазыра адкрыты першы на Гомельшчыне кабінет для лабараторных і практычных работ па хіміі.

У планах на гэты год — завяршэнне ўстаноўкі ліфта ў будынку пяціпавярховага корпуса цэнтра, што забяспечыць даступнасць аказання паслуг для людзей з абмежаванымі магчымасцямі і аблегчыць лагістыку ўнутры ўстановы.

Цэнтр таксама ўдзельнічае ў рэалізацыі праекта «Здаровыя гарады і пасёлкі», накіраванага на папулярызацыю здаровага ладу жыцця, асабліва сярод моладзі. Да 2035 года плануецца далучыць да яго яшчэ 14 аграгарадкоў.



Фельчар-лабарант мікрабіялагічнай лабараторыі Надзея КУЛАКОЎСКАЯ праводзіць даследаванне клінічнага матэрыялу метадам ПЦР.

Адзін з перспектыўных праектаў — стварэнне рэсурснага класа. У ім будуць праходзіць лекцыі, семінары і трэнінгі з дэманстрацыяй наглядных матэрыялаў. Дзеці змогуць даведацца, як фарміруюцца правілы гігіены, навошта патрэбна вакцынацыя, чым небяспечны шкодныя звычкі. Мяркуецца, што кабінет стане і месцам работы школьнага псіхолага.

— Мазырскі цэнтр гігіены і эпідэміялогіі працягвае развівацца, захоўваем традыцыі, адаптуемся да новых выклікаў. За сухімі лічбамі — паўсядзённая праца людзей, для якіх здароўе нацыі — справа жыцця, — падзякаваў калектыву за высокую прафесійную кампетэнтнасць і самааддачу ў рабоце, што дазваляе дабівацца значных вынікаў, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Мазырскага раёна Сяргей Талецкі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота Алены ДАЎЖАНОК.**

УНП 400087378








Фота Алены ДАЎЖАНОК.

# АРЭНА МАГЧЫМАСЦЯЎ

## Горад, дзе спорт — стыль жыцця

Упэўнена ўмацоўвае статус спартыўнага цэнтра Беларусі Мазыр. Фізкультурна-аздараўленчы цэнтр «Палессе-Арэна» адкрыў новыя гарызонты для правядзення спаборніцтваў самага высокага ўзроўню.

Тут размешчана сучасная спартыўная арэна вышэйшай катэгорыі, што дае магчымасць мазыранам прымаць спаборніцтвы міжнароднага ўзроўню. Унікальнасць арэны не толькі ва ўніверсальнасці, але і ў архітэктуры: трыбуны на 400 месцаў з чатырох бакоў. У краіне падобныя пляцоўкі можна літаральна пералічыць па пальцах.

— З моманту адкрыцця «Палессе-Арэна» ўжо прыняла рэспубліканскі турнір па каратэ з удзелам больш як 500 спартсменаў, маштабнае спартыўнае шоу — «Фінал чатырох» Кубка Беларусі — 2025 па гандболе сярод мужчынскіх і жаночых каманд, а таксама міжнародны турнір па міні-футболе сярод упраўленняў Следчага камітэта з удзелам каманд з Расійскай Федэрацыі. Уражанні ў гасцей засталіся самыя яркія. Яны адзначалі, што ўзровень арганізацыі не саступае сталічнаму, — падкрэслівае **дырэктар фізкультурна-аздараўленчага цэнтра «Палессе-Арэна» Аляксандр ШКОРКІН** (на фота).

Новы цэнтр забяспечыў яшчэ большае развіццё масавага спорту на Мазыршчыне. Напрыклад, у рамках праекта «Спорт для ўсіх» на базе ўстановы займаюцца дзеці, якія не з'яўляюцца выхаванцамі СДЮШАР. Каманды горада ўжо прадстаўлялі раён на абласных і рэспубліканскіх этапах. Тут прайшло свята фізічнай культуры для ўсіх узростаў — маштабная спартакіяда (звыш 20 відаў спорту) сярод работнікаў прадпрыемстваў і арганізацый, навучэнцаў каледжаў і ВНУ, прадстаўнікоў аграпрамысловага комплексу Мазырскага раёна.

Увогуле спартыўны аб'ект Мазыршчыны жыве вельмі насычаным жыццём: ад масавых мерапрыемстваў да трэніровак прафесіяналаў. У другім блоку цэнтра, які функцыянуе ўжо шэсць гадоў, трэніруюцца выхаванцы СДЮШАР «Жамчужына Палесся» па валейболе, займаюцца юныя футбалісты клуба «Славія-Мазыр».

— Усяго ў Мазыры дзейнічае пяць спартыўных школ. Адна з іх — найбуйнейшая ў Гомельскай вобласці — уключае восем аддзяленняў: гульнявыя віды спорту, лёгкую і цяжкую атлетыку, плаванне, адзінаборствы. Таму, безумоўна, адзін з прыярытэтных кірункаў нашага раёна — далейшае развіццё і ўмацаванне дзіцяча-юнацкага спорту. У цэнтры «Палессе-Арэна» трэніруюцца вучні спартыўных класаў, юныя выхаванцы ДЮСШ, — звяртае ўвагу **начальнік аддзела спорту і турызму Мазырскага райвыканкама Галіна КАСЦЯШКІНА** (на фота). — Задача профільных цэнтраў і школ — не толькі пошук і падрыхтоўка прафесіяналаў, але і стварэнне ўмоў для ўсіх тых, хто жадае займацца спортам. Таму залы запоўнены круглы год, а спартыўная база штогод удасканальваецца і мадэрнізуецца пры падтрымцы мясцовай улады, — падкрэслівае начальнік аддзела.

Дарэчы, у другім блоку ўстановы дзейнічае фізкультурна-аздараўленчы цэнтр з саўнай і басейнам, трэнажорнай залай, фітнес-заламі, залай харэаграфіі. Праводзяцца заняткі з насельніцтвам па аквааэробіцы, фітнесе, шахматах, стрытболе. Трэнеры працуюць як з дзецьмі, так і з дарослымі. Аздараўленчы цэнтр актыўна супрацоўнічае і з прафсаюзнымі арганізацыямі працоўных калектываў. Дзякуючы гэтаму ў жыхароў Мазыра ёсць магчымасць атрымліваць якасныя паслугі ў сферы фізічнай культуры.

У «Палессе-Арэне» не забываюць і пра ветэранаў спорту. Былыя прафесійныя спартсмены, якія завяршылі кар'еру, знаходзяць тут магчымасць заставацца актыўнымі, працягваць трэніроўкі. Гэта не проста падтрымка фізічнай формы, а падаўжэнне маладосці і прыклад для моладзі.

У цэнтры кажуць, што яны не ставяць сабе адзнак — пра іх гавораць самі людзі, якія вяртаюцца ў «Палессе-Арэну» зноў і зноў. А гэта — найлепшая ўзнагарода за працу.

# МАЛАЯ РАДЗІМА З ВЯЛІКАЙ ГІСТОРЫЯЙ

## Як школа на тэрыторыі былой вайсковай часці выхоўвае грамадзян і патрыётаў



Дырэктар Сяргей ТРАЯН паказвае сцяг «Вернасць Айчыне», якім адзначаны вялікі ўнёсак СШ № 15 у духоўна-маральнае і ваенна-патрыятычнае выхаванне моладзі.

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Сярэдняя школа № 15 г. Мазыра імя генерала Я. С. Барадунова вядомая на Гомельшчыне як школа памяці. Дзякуючы намаганням педагогаў патрыятычнае выхаванне дзяцей даўно стала неад'емнай часткай адукацыйнага працэсу, справай сэрца настаўнікаў і вучняў.



Класны кіраўнік кадэцкага класа СШ № 15 г. Мазыра Людміла ПЯТРОЎСКАЯ са сваімі вучнямі.

Фота Наталлі КАПРЫЛЕНКА.



Фота Алены ДАЎЖАНОК.



Святлана ЗУБКОВА, класны кіраўнік 4 «А», з вучнямі. Мікіта МІШКОЎ 4 «А», Кацярына КРУПА 4 «А», Арцём МЕЙЛАХ 6 «Б», Дзяніс ЖУКАВЕЦ і Соф'я ГЛЮЗА 3 «А» прэзентуюць праект «Экспрэс незабыўнай памяці».

Гэта навучальная ўстанова названа ў гонар аднаго з першых кіраўнікоў мабільных ракетных комплексаў на колавай цягавай установцы — генерала Яўгена Сямёнавіча Барадунова. У 1974—1980 гадах Яўген Сямёнавіч прыняў камандаванне 33-й дывізіяй РВСП, часці якой працяглы час дыслацыраваліся якраз на Прыпяцкім Палессі, на Мазыршчыне. У самім Мазыры тады вырас вялікі ваенны гарадок. На яго тэрыторыі ў канцы 1980-х і пабудавалі сярэднюю школу № 15. І гэту ваенна-патрыятычную сувязь пакаленняў у навучальнай установе няспынна падтрымліваюць.

Як звяртае ўвагу **дырэктар школы Сяргей ТРАЯН,** на базе ўстановы створаны два ўнікальныя музеі: у гонар 61-й арміі, якая ў 1944 годзе вызваляла Мазыр, і музей, прысвечаны 33-й ракетнай дывізіі. Гэтыя музейныя экспазіцыі (сабраны дакументы, асабістыя рэчы франтавікоў, макеты ваеннай тэхнікі) — вынік шматгадовай пошукавай і даследчай работы навучэнцаў і педагогаў.

Да 70-годдзя Вялікай Перамогі ў школьным двары вучні, педагогі, ветэраны заклалі сад «Праўнукі Перамогі». Устаноўлены каля школы таксама памятны знак «Ракета» ў гонар 33-й дывізіі. Пад ім пакінута калектыўнае пасланне нашчадкам, якое павінна быць адкрыта ў 2045 годзе. Рыхтуюцца ў школе таксама адкрыць памятны знак у гонар 7-й гвардзейскай брыгады рэактыўнай артылерыі і галоўнага сімвала савецкай артылерыйскай моцы — баявой машыны «Кацюша».

— Адна з вельмі творчых ваенна-патрыятычных ініцыятыў нашых вучняў і педагогаў — праект «Экспрэс незабыўнай памяці», — падкрэслівае Сяргей Траян. — Сабраны матэрыял па розных эпізодах Вялікай Айчыннай вайны. На сёння гэта больш за 70 тэматычных раздзелаў-«вагонаў», прысвечаных ключавым падзеям ваеннай гісторыі. Вучні рыхтуюць інфармацыйныя буклеты, працуюць над стварэннем віртуальнага гіда, самі праводзяць экскурсіі і ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую прэзентацыю свайго «вагона».

У планах педагогаў і вучняў адкрыць новыя выставачныя праекты на ваенна-тэхнічную тэматыку, аб дзейнасці медыцынскай службы на фронце і аб сучасных Узброеных Сілах Беларусі. Усё гэта знойдзе адлюстраванне ў праекце «Жывая гісторыя».

Сёння ў СШ № 15 дзейнічаюць класы грамадзянска-патрыятычнага выхавання і прафесійна-арыентацыйнага кірунку ў рамках супрацоўніцтва з Акадэміяй МУС Рэспублікі Беларусь.

Дысцыпліна, адказнасць, самакантроль, імкненне да самаўдасканалення... Такія якасці фарміруюць у вучняў. **Класны кіраўнік кадэцкага класа Людміла ПЯТРОЎСКАЯ** адзначае, што падчас навучання кадэты вызначаюцца не толькі актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, але і ўвогуле гарманічна развіваюцца, паказваюць вельмі добрую паспяховасць па вучэбных прадметах. «Актыўна ўдзельнічаем у гарадскіх і раённых мерапрыемствах, выязджаем на экскурсіі ва ўсе знакавыя месцы памяці Беларусі, мемарыяльныя комплексы. Вельмі важна, што самую шчырую падтрымку ў гэтай рабоце з дзецьмі нам, педагогам, аказваюць бацькі», — кажа яна.

Школа плённа супрацоўнічае з Акадэміяй МУС. У рамках алімпіяды «Феміда» вучні неаднаразова станавіліся прызёрамі. Наладжана супрацоўніцтва з Акадэміяй МНС, вайсковымі факультэтамі грамадзянскіх ВНУ. Кожны год дзясяткі выпускнікоў мазырскай школы выбіраюць для паступлення ваенныя, праваахоўныя спецыяльнасці.

— Наша задача — не проста навучыць, а выхаваць абаронцаў Айчыны.

Вучні наведваюць факультатыўныя заняткі «Гатовы Радзіме служыць!». Для многіх — гэта платформа для самавызначэння, — падкрэслівае **кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні СШ № 15 Мікалай СТАРЫКАЎ.** — Нашы вучні імкнуцца ў будучыні быць карыснымі сваёй Радзіме. А мы — побач, каб закласці аснову асобы сапраўднага патрыёта, навучыць, падтрымаць. Ва ўстанове адукацыі дзейнічае ваенна-патрыятычны клуб «Арлан».

Школай наладжаны вельмі цесныя сувязі з Тураўскай епархіяй Беларускай праваслаўнай царквы. На базе навучальнай установы дзейнічае рэсурсны цэнтр па духоўна-маральным выхаванні, чым, сапраўды, ганарацца педагогі школы, вучні і іх бацькі.

УНП 400036117

# ЭНЕРГІЯ ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ

## Як працуюць лідары газазабеспячэння

ГОМЕЛЬОБЛГАЗ
ПУ «МОЗЫРЬГАЗ»




Сёння газ — гэта не толькі звыклая з'ява ў кожным доме, але і велізарная адказнасць для тых, хто штодня забяспечвае яго бесперабойную і бяспечную падачу. Вытворчае ўпраўленне «Мазыргаз» РВУП «Гомельаблгаз» ужо трэці год запар прызнаецца найлепшым у рэгіёне сярод арганізацый, што займаюцца газазабеспячэннем. За высокія вынікі і паспяховае выкананне ўсіх сацыяльна-эканамічных паказчыкаў філіял занесены на абласную Дошку гонару.



Дырэктар філіяла Уладзімір ГРАМОВІЧ.

### КАМАНДА ПРАФЕСІЯНАЛАЎ

Кругласутачная адказнасць, выдатна адладжаныя працэсы, прадуманыя рашэнні і моцная каманда... Як перакананы дырэктар філіяла «Мазыргаз» Уладзімір Грамовіч, менавіта сістэмны адказны падыход дазволіў калектыву стаць адным з найлепшых у сваёй сферы.

— Мы гарантуем якаснае газазабеспячэнне прамысловых спажыўцоў, юрыдычных асоб і насельніцтва. Вядзём пастаянны кантроль за станам сістэм, замяняем абсталяванне, укараняем новыя тэхнічныя рашэнні, — падкрэслівае Уладзімір Грамовіч.

Сёння «Мазыргаз» — гэта 550 супрацоўнікаў. Філіял абслугоўвае пяць раёнаў: Мазырскі, Нараўлянскі, Ельскі, Калінкавіцкі і Лельчыцкі. Пастаўляе прыродны і звадкаваны газ, абслугоўвае ўнутрыдамавое абсталяванне і падземныя газаправоды. У яго склад уваходзіць Калінкавіцкая газанапаўняльная станцыя, якая забяспечвае звадкаваным газам усю Гомельскую вобласць.



### ТЭХНАЛОГІІ НА СЛУЖБЕ НАДЗЕЙНАСЦІ

«Мазыргаз» — тэхналагічна развітая структура. Тут пастаянна вядзецца мадэрнізацыя абсталявання, укараняюцца перадавыя рашэнні. Уся дзейнасць упраўлення базіруецца на сучасных праграмных прадуктах: ад аховы працы да кантролю расходу паліва.



Як адзначае **першы намеснік дырэктара — галоўны інжынер Аляксандр ГАЙКОЎ,** філіял адным з першых сярод структурных падраздзяленняў РВУП «Гомельаблгаз» пачаў маштабную лічбавізацыю: праграмы дазваляюць кантраляваць трубаправоды, аналізаваць спажыванне газу, сачыць за выкананнем работ.

### КЛІЕНЦКІ СЭРВІС НОВАГА ЎЗРОЎНЮ

Асаблівай гордасцю філіяла стаў Цэнтр абслугоўвання насельніцтва, адкрыты ў Мазыры ў 2021 годзе. Тут кліенты могуць атрымаць кансультацыю, заключыць дагавор, афарміць дакументы — зрабіць усё ў адным месцы. Інтэрактыўныя сэрвісы, электронная чарга, шырокія магчымасці зваротнай сувязі сведчаць аб сучасным падыходзе. Абсталяваныя навучальны клас і дэманстрацыйная зала. Цэнтр аб'яднаў спецыялістаў розных кірункаў, павысіўшы аператыўнасць вырашэння задач.

### ПЕРАМОГІ, ШТО НАТХНЯЮЦЬ

У «Мазыргазе» ўпэўнены: кадры — аснова поспеху. Вялікае значэнне ў калектыве надаюць падрыхтоўцы спецыялістаў.

Асаблівая ўвага — умовам працы. Адной з сур'ёзных інвестыцый у бяспеку стала будаўніцтва ў 2016 годзе шматфункцыянальнага комплексу, на базе якога праходзіць навучанне супрацоўнікаў і праводзяцца конкурсы прафесійнага майстэрства. Тут створана рэальная інфраструктура газаразмеркавальнай сістэмы, што дазваляе навучаць і правяраць навыкі ва ўмовах, максімальна набліжаных да працоўных.

— На базе вучэбна-трэніровачнага комплексу ідзе бесперапыннае павышэнне кваліфікацыі. Тут мадэлююцца рэальныя сітуацыі — ад аварый да нестандартных тэхнічных выпадкаў, — кажа **начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела Аляксандр ХАЛМЯКОЎ.**



Начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела Аляксандр ХАЛМЯКОЎ правярае практычныя навыкі па рамонце ацяпляльнага абсталявання ў слесара Аляксандра МУЖЭНКІ.

Супрацоўнікі таксама праходзяць навучанне ў цэнтры «ГАЗ-ІНСТЫТУТ» і паспяхова ўдзельнічаюць у прафесійных конкурсах.



У чэрвені 2024 года Мазыр прымаў Рэспубліканскі конкурс на званне «Найлепшая брыгада ДВА «Белпалівагаз» па тэхнічным абслугоўванні газавыкарыстоўвальнага абсталявання». Перамогу ў намінацыі «Найлепшы майстар» атрымала **Таццяна КУЛАГА,** а ў намінацыі «Найлепшы слесар» — **Віталь ЗБОРНІКАЎ.** Абое прадстаўляюць ВУ «Мазыргаз». У жніўні таго ж года інжынер апарата кіравання **Віктар КАЗЛОЎ** стаў найлепшым спецыялістам па пажарнай бяспецы на рэспубліканскім конкурсе.

— Мы заахвочваем ініцыятыўных, падтрымліваем маладых спецыялістаў, — падкрэслівае Уладзімір Грамовіч.

У «Мазыргазе» можна набываць веды за кошт упраўлення, прайсці перападрыхтоўку, пачаць новы прафесійны шлях. Маладыя спецыялісты атрымліваюць накіраванні, заключаюць дагаворы і ведаюць: падтрымка ім гарантаваная.

Не застаюцца ўбаку мазырскія газавікі і ад грамадскага жыцця. У аграгарадку Белая яны адрамантавалі мемарыял воінам, загінулым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта не проста сацыяльны праект — гэта акт памяці і павагі да гісторыі.



Калектыў актыўна ўдзельнічае ў спартыўных і культурных мерапрыемствах. Падчас абласной спартакіяды, прысвечанай 80-годдзю вызвалення Беларусі, каманда філіяла «Мазыргаз» заняла першае месца. Гэта сведчыць аб тым, што ў арганізацыі працуюць моцныя духам і цэлам людзі, здольныя паказваць вынік не толькі на вытворчасці.



Цэнтр абслугоўвання насельніцтва.



Інжынер службы заказчыка Наталля ЯНІСАВА кансультуе кліентку па пытаннях газіфікацыі.



Ганаровае першае месца на XXI летняй спартакіядзе РВУП «Гомельаблгаз».

Фота Лізаветы ГОЛАД.

УНП 400035057

Матэрыялы паласы падрыхтавалі Наталля КАПРЫЛЕНКА, Алена ДАЎЖАНОК.

# НАЙЛЕПШУЮ СОЛЬ ВАРАЦЬ У МАЗЫРЫ

## Адказны, гаспадарчы падыход да таго, што дала прырода



Такі стратэгічны прадукт харчавання як соль у Беларусі забяспечаны з вялікім запасам — гарантуюць суайчыннікам мазырскія салявыя прамыслоўцы. Кампанія ААТ «Мазырсоль» — найбуйнейшы вытворца вакуум-выварачнай солі гатунку «экстра» на тэрыторыі краін СНД і Усходняй Еўропы — актыўна нарошчвае патэнцыял, павышае прадукцыйнасць вытворчасці, забяспечвае харчовую бяспеку нашай краіны. Прадпрыемства не аднойчы атрымлівала ўзнагароды самага рознага ўзроўню: прызнавалася лаўрэатам прэміі Урада ў галіне якасці, станавілася брэндам года, а ў 2024-м чарговы раз пацвердзіла свой поспех і заняло заслужанае месца на абласной і Рэспубліканскай дошках Гонару.

## УНІКАЛЬНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ

ААТ «Мазырсоль» утварылася на базе велізарных радовішчаў каменнай солі, адкрытых недалёка ад Мазыра ў 1975 годзе. Сам завод увялі ў эксплуатацыю ў снежні 1982-га. Так пачаўся вялікі шлях мазырскай солі, якую сёння ведаюць і любяць мільёны людзей у самых розных пунктах планеты. І любоў ды пашана да спажыўцоў свайго прадукту ў мазырскіх салявых прамыслоўцаў узаемная і такая ж шчырая. «Мазырсоль» гарантуе найвышэйшую якасць сваёй прадукцыі.

Дарэчы, сучасная вытворчасць солі — замкнёны цыкл. Напрыклад, ад здабычы да фасавання рука чалавека не дакранаецца да солі. І першы, хто бярэ гэту прадукцыю рукамі, — непасрэдна спажывец.

Стартавая пляцоўка вытворчага ланцужка — горназдабыўны цэх. Тут, на глыбіні залягання ад 800 да 1350 метраў распрацоўваюцца залежы каменнай солі. Здабываюць белае золата метадам падземнага растварэння: у дзесяць свідравін расолапромыслу падаецца вада. Яна растварае ў сабе галіт (мінерал), а ўжо расол неабходнай канцэнтрацыі падымаецца на паверхню. Па расолаправодзе салявую вадкасць перапампоўваюць на асноўную пляцоўку — цэх № 2. Яго называюць сэрцам завода. Менавіта тут атрыманы насычаны расол праходзіць асноўныя вытворчыя этапы: ачыстку, выпарванне, цэнтрыфугаванне, сушку. Працэс ідзе ў бесперапынным рэжыме.



Галоўны тэхнолаг Сяргей ЧУМАК.

— Завод унікальны тым, што асноўнае абсталяванне — выпарныя апараты — зроблена з устойлівага да каразійнага ўздзеяння солей тытанавага сплаву. Мы — адзіны завод на прасторы СНД, дзе ўстаноўлена такое абсталяванне. На працягу больш як 40 гадоў яно працуе без маральнага і фізічнага зносу. Дзякуючы высокай ступені ачысткі зыходнага расолу, дакладнаму захаванню ўсіх тэхналагічных працэсаў выпаркі, цэнтрыфугавання, сучасным тэхналогіям сушкі мы вырабляем прадукт, які адпавядае ўсім патрабаванням нацыянальных і міжнародных стандартаў, — з гонарам за роднае прадпрыемства адзначае **галоўны тэхнолаг ААТ «Мазырсоль» Сяргей ЧУМАК.**

Дабіцца такой высокай якасці прадукцыі ўдалося праз маштабную мадэрнізацыю па аўтаматызацыі працэсаў вытворчасці. Пачалася яна больш як дзесяць гадоў таму і не спыняецца да гэтага часу.

## ЭФЕКТЫЎНАЯ КАМАНДА

Вось ужо чацвёрты год, як калектыў прафесіяналаў салявой вытворчасці «Мазырсоль» ўзначаліў чалавек з велізарным досведам кіраўнічай работы — **Уладзімір ДВОРНІК.** За гэты час ААТ удалося рэкордна знізіць выдаткі, выбудаваць эфектыўную тэхналогію вытворчасці, узняць узровень дастатку сваіх працаўнікоў.

**— Сапраўдны гонар «Мазырсолі» — перш за ўсё моцная каманда, — падкрэслівае Уладзімір Андрэевіч. — Без мэтанакіраванага згуртаванага калектыву немагчыма было б дасягнуць эфектыўнай работы, стапрацэнтнай загрузкі прадпрыемства і ў цэлым высокай ацэнкі на дзяржаўным узроўні. Калектыў «Мазырсолі» — гэта людзі, якія цэняць сваю справу, ганарацца сваім прадпрыемствам, шануюць сваю краіну і гатовы рабіць усё для яе працвітання.**



Генеральны дырэктар ААТ «Мазырсоль» Уладзімір ДВОРНІК.

## АДКАЗНЫ ПАДЫХОД

Істотны фактар, які дазваляе «Мазырсолі» на роўных канкурыраваць з вытворцамі на знешнім рынку, — зніжэнне сабекошту прадукцыі. Каб дабіцца поспеху ў гэтым кірунку, на прадпрыемстве ўдасканальваюць тэхналогіі і эканомію паліўна-энергетычных рэсурсаў. Калі ў папярэднія гады ў структуры затрат энерганосьбіты займалі больш за 40 %, то сёння на прадпрыемстве ўдалося зменшыць выдаткі на энерганосьбіты на адзінку прадукцыі на 35 %, а ў аб'ёме затрат гэты артыкул расходаў знізіўся да 24 %. Цеплавую энергію ў выглядзе пары і гарачай вады выпрацоўвае ўласная кацельня. Свая блок-станцыя забяспечвае і электраэнергіяй.

Шукаюць на «Мазырсолі» і новыя падыходы ў павышэнні эфектыўнасці вытворчасці. Апошнія гады на прадпрыемстве ўклалі значныя сродкі як у будаўніцтва новых аб'ектаў, так і ў набыццё абсталявання і тэхнікі, укараненне інавацыйных тэхналогій.




Яшчэ адзін важны кірунак, які не так даўно з'явіўся ў дзейнасці прадпрыемства, — аграрны. У сельскай гаспадарцы мазырскай кампаніі за кароткі тэрмін таксама ўдалося паказаць вельмі плённыя вынікі. Структурным падраздзяленнем ААТ «Мазырсоль» на тэрыторыі Ельскага раёна стала гаспадарка «Ельскае Палессе». Былое стратнае сельгаспрадпрыемства набылі за адну базавую велічыню і паставілі для сябе задачу — за тры гады ператварыць яго ў сучаснае і эфектыўнае. Ужо за першы год сельгасарганізацыя дасягнула высокіх тэмпаў росту і стала лідарам у Ельскім раёне ў сферы жывёлагадоўлі. Але самае галоўнае — людзі ў гаспадарцы атрымалі магчымасць сваёй працай зарабляць дастойныя грошы.

## І ДЛЯ ВАДЫ, І ДЛЯ СМАЧНЫХ КАЎБАС

У папярэднія гады на вытворчасці правялі мадэрнізацыю сушыльнага аддзялення, а летась закупілі цэнтрыфугі павышанай магутнасці, што забяспечыла рэзерв абсталявання і магчымасць эфектыўна спраўляцца з вытворчымі аб'ёмамі, якія павялічваюцца з кожным годам.

Самае буйное і шматлікае падраздзяленне на заводзе — цэх фасоўкі. Яго вытворчая магутнасць дазваляе за суткі пакаваць больш за паўтары тысячы тон рознай гатовай прадукцыі. А яе каля 60 найменняў.

У цэху фасоўкі таксама вырабляецца прадукт на аснове комплексных харчовых дабавак — пасолачна-нітрытная сумесь, якая выкарыстоўваецца ў вытворчасці прадуктаў харчавання, мясаперапрацоўчай прамысловасці. ААТ «Мазырсоль» спецыялізуецца і на выпуску табледціраванай солі для пасудамыечных машын, падрыхтоўкі і змякчэння вады.

— Мы пастаянна ўдасканальваемся ў вытворчасці, развіваем тэхналогіі. Калі яшчэ некалькі гадоў таму прадукцыйнасць солі ў нас была 69 тон у гадзіну на дзвюх сістэмах, то сёння мы атрымліваем ужо 80 тон, — дадае галоўны тэхнолаг ААТ «Мазырсоль» Сяргей Чумак. — Увогуле варыць соль — гэта такі займальны працэс, выклік інжынерам-тэхнолагам. Можна бясконца ўдасканальвацца ў вытворчасці. Ёсць яшчэ да чаго імкнуцца.



Апаратчык змешвання Андрэй БЕЛЫ фасуе прадукцыю.

## УСІМ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ




Для чалавека зусім не ўсё роўна, якой якасці прадукты ён спажывае. Гэта, безумоўна, датычыцца і кухоннай солі. Калі ўлічыць, што ў саляных пластах і ў рапе салёных азёр могуць утрымлівацца розныя прымесі, якія часта з'яўляюцца шкоднымі, становіцца зразумелым, чаму на харчовыя мэты выкарыстоўваюць толькі высакаякасную выварачную соль, такую як мазырская.

ААТ «Мазырсоль» — адзінае прадпрыемства ў краіне і адно з найбуйнейшых на постсавецкай прасторы, дзе выпускаецца вакуум-выварачная соль гатунку «экстра». Менавіта гэты гатунак прымяняецца паўсюдна ў харчовай прамысловасці, вытворчасці дзіцячага харчавання, медыцыне. Вакуум-выварачная соль адрозніваецца чыстым складам і адсутнасцю прымесей: утрыманне хларыду натрыю ў ёй 99,8 %. Вырабляюць на прадпрыемстве і соль з дабаўленнем ёду. Яе ўжыванне асабліва актуальнае ў Беларусі і шматлікіх іншых рэгіёнах з дэфіцытам ёду ў харчовых прадуктах і вадзе.

Дарэчы, высокія спажывецкія характарыстыкі прадукцыі ААТ «Мазырсоль» забяспечваюцца інтэграванай ва ўсе вытворчыя працэсы сістэмай кіравання якасцю, атэставанай стандартам ISO 9001. Кантроль за якасцю прадукцыі ажыццяўляецца акрэдытаванай лабараторыяй прадпрыемства на кожным этапе яе вытворчасці.




Лінія пакавання солі.

## СКЛАДНІКІ ПОСПЕХУ

— Каштоўнасць прадукцыі «Мазырсолі» для спажыўца не толькі ў тым, што мы вырабляем высакаякасны прадукт. Наша прадпрыемства — надзейны пастаўшчык, які своечасова, рытмічна пастаўляе прадукцыю, згодна з усімі пажаданнямі пакупнікоў, — падкрэслівае **намеснік генеральнага дырэктара ААТ «Мазырсоль» Мікалай ДУДКОЎСКІ.**

Тэхнічнае пераўзбраенне, мадэрнізацыя і рацыянальныя кіраўнічыя рашэнні ў апошнюю пяцігодку вывелі ААТ «Мазырсоль» на новы ўзровень развіцця.

— У цэлым за суткі мы выпускаем 2400 тон солі. Па выніках мінулага года на прадпрыемстве выраблі 590 тысяч тон. Нават у цяперашніх няпростых эканамічных умовах працуем з поўнай загрузкай, прадукцыю не складзіруем — рэалізоўваем літаральна «з колаў», — звяртае ўвагу Мікалай Дудкоўскі. — Дзякуючы супрацоўніцтву з чыгункай ажыццяўляем пастаўкі дакладна ў тэрмін. Каб знізіць выдаткі на транспарціроўку, забяспечыць пастаўкі прадукцыі ў самыя аддаленыя рэгіёны, з якімі працуем, набылі ўласныя чыгуначныя вагоны.



Намеснік генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях Мікалай ДУДКОЎСКІ расказвае пра соль грануляваную для пасудамыечных машын.

## ДЗЕ ЧАКАЮЦЬ?

ААТ «Мазырсоль» сёння поўнасцю закрывае патрэбы айчыннага рынку і забяспечвае стабільны экспарт. За мяжу з Мазыра адгружаецца больш за 80 % атрыманай прадукцыі. Увогуле кампанія дакладна вызначылася са сваім курсам экспарту і замацавалася на рынках дзесяці краін.

Асноўным рынкам збыту для мазыран застаецца Расійская Федэрацыя. Сваю прысутнасць у рэгіёнах краіны-суседкі ААТ «Мазырсоль» яшчэ больш умацавала і значна павялічыла аб'ёмы рэалізацыі прадукцыі ў апошнія гады. Прадпрыемству ўдалося нарасціць экспарт і на рынках Казахстана, Кыргызстана, іншых краін СНД. Сёння мазырскія вытворцы солі імкнуцца замацавацца на рынках Паўднёва-Усходняй Азіі і Кітая.



Склад гатовай прадукцыі.

## З УВАГАЙ ДА ЛЮДЗЕЙ

Увогуле арыентаванасць на калектыў, забеспячэнне патрэб працаўнікоў, сацыяльная падтрымка сваіх супрацоўнікаў — фірменны стыль «Мазырсолі». Тут умеюць матываваць падтрымку высокага ўзроўню прафесіяналізму і згуртаванасць калектыву.

Сёння ў ААТ «Мазырсоль» працуе 835 супрацоўнікаў. І кожны цэніць сваё месца работы. Склалася і чарга з ахвотных працаваць на прадпрыемстве.

Як адзначае **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце і сацыяльным развіцці ААТ «Мазырсоль» Таццяна ВІТКОЎСКАЯ,** прываблівакоць працаўнікоў і сучасныя вытворчыя памяшканні, і бяспечныя ўмовы працы, і дастойная заработная плата. Вельмі грунтоўны бонус на прадпрыемстве — выдатны сацыяльны пакет, які прадугледжвае дапамогу і значныя выплаты практычна ў любой жыццёвай сітуацыі. Акрамя таго, тут падтрымліваюць прыхільнасць да здаровага ладу жыцця: аплачваюць заняткі спортам, прадугледжаны нават даплаты тым, хто не курыць. Мясцовы медпункт — фактычна невялікі медыцынскі цэнтр пад бокам. Вельмі ўдзячныя супрацоўнікі «Мазырсолі» і за арганізацыю для іх мноства цікавых мерапрыемстваў і экскурсій.

Прынамсі, менавіта ААТ «Мазырсоль» — адзін з самых папулярных аб'ектаў прамысловага турызму не толькі ў Гомельскай вобласці, але і ў Беларусі. Турысты з задавальненнем карыстаюцца магчымасцю на свае вочы пабачыць, што ўяўляе сабой вытворчасць беларускага белага золата. На заводзе арганізуюць па-сапраўднаму пазнавальныя экскурсіі, сустрэчы з дасведчанымі спецыялістамі салявога флагмана. Цяжка пераацаніць значнасць такога досведу ў плане прафарыентацыйнай работы са школьнікамі і навучэнцамі. Кожны заводскі працэс дзяцей і падлеткаў не толькі ўражвае, але і знаёміць з рознымі рабочымі спецыяльнасцямі.



Намеснік генеральнага дырэктара па ідэалогіі і сацыяльным развіцці Таццяна ВІТКОЎСКАЯ.

Наталля КАПРЫЛЕНКА, Алена ДАЎЖАНОК, фота Лізаветы ГОЛАД.

УНП 400087365


Трэцяе прыёмнае аддзяленне па дапрацоўцы катахаў кукурузы.



МТФ-600 «Гурыны».

# ГАСПАДАРКА З ВЯЛІКІМ ПАТЭНЦЫЯЛАМ

## Шматгаліновасць як аснова поспеху

КСУП «Эксперыментальная база «Крынічная» — адно з найбуйнейшых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Мазырскага раёна. Яго прадукцыя рэалізоўваецца па ўсіх рэгіёнах Беларусі, а кірунні дзейнасці ўражваюць разнастайнасцю. Акрамя класічнай жывёлагадоўлі і раслінаводства, прадпрыемства выпускае прадукцыю кукурузакаліброўвачнага завода, а таксама радуе пакупнікоў высакаякаснымі кансервамі з натуральнай агародніны і садавіны.

### ГОДНЫЯ ЎМОВЫ — ВЫДАТНЫ ВЫНІК

У склад КСУП «Эксперыментальная база «Крынічная» сёння ўваходзяць 7 малочнатаварных комплексаў, 7 таварных ферм, кукурузакаліброваччны завод і цэх кансерваванай кукурузы.

— У нас вельмі цікавая гаспадарка з высокім патэнцыялам, — адзначыў **дырэктар прадпрыемства Мікалай РУБАХА.** — Мы займаемся вытворчасцю і рэалізацыяй элітных сартоў збожжавых і каласавых культур, а таксама кукурузы і бульбы. Нараўне з гэтым у нас вельмі высокаразвітая жывёлагадоўля. На дадзены момант 11 500 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 3300 дойных кароў, рэалізацыя малака ад якіх складае больш за 60 тон у суткі, пераважна гатункам «экстра» і «вышэйшы».

Характэрна і тое, што КСУП «Эксперыментальная база «Крынічная» — адзіная ў Беларусі племянная ферма па вырошчванні сіментальскай жывёлы і яе мешанак. Менавіта з гэтай пародай прадпрыемства заўсёды займае прызавыя месцы на выставе «Белагра».


Дырэктар Мікалай РУБАХА.

Таксама Мікалай Рубаха падзяліўся і іншымі рэкордамі прадпрыемства ў галіне жывёлагадоўлі:

— У МТФ-600 «Гурыны» за мінулы год мы атрымалі выдатны вынік: надой на адну карову склаў 12 200 літраў малака. Гэта практычна найвышэйшая планка. Каб рухацца далей, трэба ўкараняць новыя тэхналогіі, таму мы пачалі шырока выкарыстоўваць нарыхтоўку сенажу ў стрэйч-плёнку, падымаючы пажыўнасць да 0,38-0,40 кармавой адзінкі на кілаграм. Плануем таксама прымяняць выраблену на «Гомсельмашы» прыстаўку да кормаўборачнага камбайна для драбнення катахаў. Гэта дасць дадатковую энергію і магчымасць яшчэ больш павялічыць аб'ём малака.

Варта адзначыць, што ў хуткім часе рыхтуецца да ўводу ў эксплуатацыю яшчэ адзін МТК, размешчаны ў Нараўлянскім раёне. Дзякуючы яму колькасць дойнага пагалоўя павялічыцца да 4700 прадукцыйных кароў.

За дасягненні ў галіне раслінаводства і жывёлагадоўлі ў 2024 годзе КСУП «Эксперыментальная база «Крынічная» занесена на Дошку гонару Гомельскай вобласці. На думку дырэктара, сакрэт высокіх паказчыкаў — у добрых умовах працы.

— Каб атрымліваць вынік, трэба ствараць людзям умовы. За сваю практыку я неаднаразова назіраў, наколькі цесна гэта ўзаемазвязана. Калісьці да нас была далучана стратная гаспадарка КСУП «Уладзіміраўскі-Галоўчыцы». Мы стварылі там добрыя ўмовы працы, абнавілі абсталяванне і склалі камфортны працоўны графік. Як вынік: пры высокай заработнай плаце знікла праблема з кадрамі, і сёння гэта аддзяленне ўжо стабільна прыносіць прыбытак у агульную скарбонку гаспадаркі, — адзначыў Мікалай Рубаха.

Яшчэ адным узорам з'яўляецца і Ельскі цэх кансервацыі прадукцыі, які таксама быў далучаны да эксперыментальнай базы як стратнае прадпрыемства.

— Мы змаглі адаптаваць і ўкараніць туды свае тэхналогіі, значна падняць працоўную і тэхналагічную дысцыпліну. Усё гэта дазволіла зменшыць стратнасць прадпрыемства і цалкам пагасіць запазычанасць. Сёлета пасеялі 100 га гарошку зялёнага, чакаем добры ўраджай і павышэння эканамічных паказчыкаў цэха. Гэта прадпрыемства ўжо стала рэнтабельным і неаднаразова займала прызавыя месцы на конкурсе кансерваванай прадукцыі «Хрустальны яблык», — падзяліўся Мікалай Рубаха.


Ветэрынарны ўрач Мікалай БАГДАНОВІЧ у адкрытым прафілакторыі для цялят.

### З КЛОПАТАМ АБ ЛЮДЗЯХ

Забяспечыць работнікам добрыя ўмовы працы і жыцця — вось прыярытэт кіраўніцтва КСУП «Эксперыментальная база «Крынічная». **Намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Аксана ГРЫБ** расказала, што тут жыллёвае пытанне вырашаюць амаль адразу пры ўладкаванні на працу.


Намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Аксана ГРЫБ.

— У нас вялікі жылфонд — звыш 300 адзінак. У пасёлку Крынічны пяціпавярховыя аднапад'ездныя дамы на 20 кватэр, два інтэрнаты і домікі сядзібнага тыпу. Людзі атрымліваюць жыллё згодна з іх сямейным становішчам. Дарэчы, праз пэўны час з'яўляецца магчымасць выкупу арэнднага жылля, — адзначыла яна.

З вялікай увагай тут адносяцца і да здароўя супрацоўнікаў.

— У нас дзейнічае страхоўка на аказанне медыцынскіх паслуг: 20 % кошту аплачвае работнік, а астатнія 80 % — арганізацыя, — растлумачыла Аксана Грыб.

Апроч здзельнай аплаты штомесяц людзі атрымліваюць у фірменнай краме гаспадаркі розныя прадукты на суму 120 рублёў. Цікава і тое, што яшчэ дадаецца 10 %, калі чалавек не курыць.

— Такое невялікае матэрыяльнае стымуляванне ад нашага кіраўніка. Ён выступае за здаровы лад жыцця і імкнецца заматываваць на гэта і сваіх супрацоўнікаў, — падзялілася Аксана Грыб.

Безумоўна, агароднінай і крупамі тут таксама не абдзяляюць. Штогод кожны работнік атрымлівае па 400 кг бульбы і 30 кг морквы. А ў дадатак да гэтых бонусаў ідзе яшчэ і грэчка ўласнай вытворчасці.

Усяго на прадпрыемстве працуе каля 750 чалавек. Рэгулярна ў калектыве з'яўляюцца новыя маладыя кадры. Так, толькі за 2024 год прыйшлі 16 маладых спецыялістаў. На думку намесніка дырэктара па ідэалагічнай рабоце, моладзь прыцягвае невялікая аддаленасць ад горада Мазыра, наяўнасць жылля, годная заработная плата і добры сацыяльны пакет.

— Таксама ў нас ёсць матэрыяльнае стымуляванне для маладых спецыялістаў. Гаспадарка вельмі зацікаўлена ў супрацоўніках заветслужбы. Так, калі мы бяром чалавека на 5 гадоў, то аднаразова выплачваем яму 100 базавых велічынь. А на наступнае пяцігадовае падаўжэнне кантракта — 200 базавых велічынь, — расказала Аксана Грыб.

Уражвае і насычанае грамадскае жыццё працаўнікоў прадпрыемства. Традыцыйна тут кожны квартал праводзіцца акцыя «Наш жывёлавод». Па яе выніках выбіраюцца найлепшыя супрацоўнікі і іх узнагароджвае не толькі прадпрыемства, але і раённая прафсаюзная арганізацыя.

Па словах старшыні пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Ілоны Шчэрбін, вялікімі поспехамі гаспадарка радуе і ў спартыўных спаборніцтвах, на якіх каманда прадпрыемства атрымала перамогу на раённым і абласным этапах. Наперадзе ў чэмпіёнаў — рэспубліка!

Экскурсіі, розныя акцыі, культурныя мерапрыемствы... Карацей, усе ўмовы для якаснага баўлення вольнага часу. Было б жаданне, а магчымасцяў шмат.

**Лізавета ГОЛАД, фота аўтара.**
**Алена ДАЎЖАНОК.**

УНП 400064760


Галоўны аграном-насеннявод Ірына ГУД на зернеачышчальнай лініі № 1.

### ЗАЛОГ ДОБРАГА ЎРАДЖАЮ

Раслінаводства і жывёлагадоўля непарыўна звязаны паміж сабой. Так, на КСУП «Эксперыментальная база «Крынічная» штогод нарыхтоўваюцца сена, сянаж, сілас з захаваннем тэхналогіі для забеспячэння буйной рагатай жывёлы высакаякаснымі пажыўнымі кармамі. Усяго ў складзе гаспадаркі каля 10 500 га ралллі.

— Сёлета мы пасеялі вельмі шмат кукурузы на плошчы 5268 га: і на насенне, і на зялёны корм. Усё гэта — залог добрага ўраджаю ў будучыні і гарантыя якаснага і пажыўнага корму для нашых кароў, — падзялілася **галоўны аграном-насеннявод Ірына ГУД.**

Вядома, гаспадарка займаецца не толькі насеннем кукурузы, але і збожжавымі (яравымі, азімымі), іншымі культурамі.

— Так, сёлета ў нас будзе рэалізоўвацца азімы рапс двух сартоў, чатыры сарты азімага трыцікале, зімовае жыта, іншыя культуры і, вядома, бульба. На плошчы 50 га мы высадзілі чатыры сарты: «Скарб», «Першацвет», «Юлія» і самы папулярны «Вектар», — адзначыла Ірына Гуд.

Акрамя таго, КСУП «Эксперыментальная база «Крынічная» забяспечвае рознай агароднінай і садавіной Ельскі цэх кансервацыі прадукцыі. Спецыяльна для яго ў гаспадарцы вырошчваюць моркву, буракі, капусту, гарбуз, яблыкі, мазгавыя сарты гароху. Таксама ў эксперыментальнай базы ёсць пашпарт на вытворчасць элітных сельскагаспадарчых культур, што дае ім магчымасць рэалізоўваць насенне ў продаж.


Калектыў вытворчай лабараторыі. Злева направа: тэхнікі-лабаранты Дар'я МАРЦІНОВІЧ, Ірына КАПІТАН, старшы лабарант Вольга ДАНІЛЬЧУК, тэхнікі-лабаранты Алена СУХАНІЦКАЯ, Крысціна БАНДАРЭНКА, начальнік вытворчай лабараторыі Вольга МІХНАВЕЦ, тэхнікі-лабаранты Сняжана МАТУСЕВІЧ, Анастасія БАЛАХОНАВА, Аляксандра ГАРДЗІЕНКА, Дар'я БАБЫНА.

### КАЛІБРОЎКА ПА ДАСТе


Намеснік дырэктара кукурузакаліброўвачнага цэха Мікалай ПАЎЛЕЧКА.

Ужо больш за 20 гадоў у склад КСУП «Эксперыментальная база «Крынічная» ўваходзіць завод па перапрацоўцы і захоўванні насення кукурузы магутнасцю 2500 тон. Дарэчы, такіх заводаў у нашай краіне ўсяго два: у Мазырскім і Івацэвіцкім раёнах. Менавіта кукурузакаліброваччны цэх КСУП «Эксперыментальная база «Крынічная» спецыялізуецца на вытворчасці насення кукурузы, гібрыдаў першага пакалення розных груп спеласці ад вельмі ранніх да сярэдняпозніх.

Паводле слоў **намесніка дырэктара кукурузакаліброўвачнага цэха Мікалая ПАЎЛЕЧКІ,** за ўвесь перыяд тут было выраблена звыш 170 тысяч тон насення кукурузы, што ў грашовым выражэнні склала 290,5 мільёна беларускіх рублёў. Сам цэх ужо даўно пачаў прыносіць прыбытак гаспадарцы. У сярэднім рэнтабельнасць на працягу ўсіх гадоў — прыкладна 12,5 %.

— Вытворчыя магутнасці нашага цэха дазваляюць прыняць 25 тысяч тон катахаў кукурузы і атрымаць з гэтага аб'ёму 12,5 тысячы тон насення гібрыдаў першага пакалення. Сёлета мы ўжо рэалізавалі 7 тысяч тон насення гібрыдаў кукурузы. Усяго ў нас у асартыменце ёсць 12 відаў: 9 гібрыдаў беларускай і 3 гібрыды расійскай селекцыі, — падзяліўся Мікалай Паўлечка.

Важна і тое, што завод з'яўляецца імпартазамяшчальным прадпрыемствам.

— Наша гібрыднае насенне ў 4-5 разоў таннейшае за імпартныя аналагі. І калі поўнасцю вытрымаць тэхналогію вытворчасці, то яно нічым не ўступае замежнаму ў плане ўраджайнасці.




Да таго ж, мы з'яўляемся адзіным вытворцам у Беларусі, які працуе паводле пастановы № 37. Гэта значыць, што наш завод вырабляе насенне паводле ДАСТа і што яно адпавядае ўсім патрабаванням еўрапейскага стандарта, — растлумачыў намеснік дырэктара кукурузакаліброўвачнага цэха.

Адметна, што самым запатрабаваным відам сярод прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу з'яўляецца гібрыд «Палескі 212». Ён стабільна дае ўраджай па зялёнай масе і ў яго вельмі высокія паказчыкі выспявальнасці.

Кукурузакаліброваччны цэх абслугоўвае 114 чалавек, больш як палова з іх — высокакваліфікаваныя работнікі. Аднак падчас дапрацоўкі катахаў кукурузы тут з'яўляецца яшчэ каля 100 дадатковых працоўных месцаў.

На тэрыторыі кукурузакаліброўвачнага цэха знаходзіцца і акрэдытаваная вытворчая лабараторыя, дзе ажыццяўляецца кантроль якасці на ўсіх этапах вытворчасці: ад прыёмкі катахаў да рэалізацыі ўжо гатовага пратручанага насення.

— У нас ёсць схема лабараторнага кантролю: 2-3 разы за змену лабаранты ходзяць па кукурузакаліброўвачным цэху і адбіраюць аналізы. Мы працуем толькі па ДАСТе, таму ўсё наша насенне адпавядае стандарту. Таксама ў нашай лабараторыі ёсць акрэдытацыя, што дае нам магчымасць аказваць паслугі іншым арганізацыям па праверцы ўзораў і выдачы пратакола выпрабаванняў, — падзялілася **начальнік вытворчай лабараторыі Вольга МІХНАВЕЦ.**


Старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Ілона ШЧЭРБІН з пасведчаннем аб занясенні гаспадаркі на Дошку гонару Гомельскай вобласці.




Трактарысты-машыністы Віктар ЗАЯЦ і Дзмітрый РЫМША косяць люцэрну.


Падрыхтоўка сенажу з люцэрны.



# БЕРАГ ГАСЦІННАСЦІ

## Тут не толькі развіваюць турызм, але і ствараюць імідж горада



Гасцінічны комплекс «Прыпяць» — візітная картка Мазыра і вядомае прадпрыемства айчыннага турыстычнага сегмента — актыўна падтрымлівае развіццё рэгіянальнага адпачынку, культурных маршрутаў і спартыўных падзей. Мазыр — запатрабаваная пляцоўка, якую выбіраюць для правядзення мерапрыемстваў абласнога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў. «Прыпяць» умее сустракаць гасцей.



Дырэктар Сяргей КАНОПЛІЧ.

### ШЫРОКІ СПЕКТР ПАСЛУГ

Размешчаны ў самым сэрцы Мазыра комплекс з панарамным відам на Прыпяць прыцягвае не толькі турыстаў, але і дзелавых гасцей, удзельнікаў афіцыйных дэлегацый, спартсменаў, якія прыбываюць на спаборніцтвы, і тых, хто едзе ў горад па асабістых справах.

Пачалася гісторыя «Прыпяці» ў савецкія часы — не здраджваюць традыцыям гасціннасці тут ужо на працягу 40 гадоў. Сёння гэта абноўлены комплекс, які адпавядае ўсім сучасным патрабаванням камфорту.

